АБ РАЗГОРТВАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 207 (4112)
НЯДЗЕЛЯ, 2 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

УСІМ ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ, ГАСПАДАРЧЫМ, ЗЯМЕЛЬНЫМ І КАЛГАСНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Савет Народных Камісараў СССР лічаць работу па стварэньні і ўмацаваньні сацыялістычнага сэктару ў галіне жывёлагадоўлі — саўгасаў і калгасных таварных фэрм — цэнтральнай задачай бліжэйшага часу ў галіне сельскай гаспадаркі. 1931 і 1932 гады пазіцны быць гадамі такога-ж рашучага пералому ў галіне разгортваньня жывёлагадоўлі, якімі былі 1929 і 1930 гады ў справе арганізацыі сацыялістычнай збожжавай гаспадаркі.

Ня гледзячы на кароткі тэрмін свайго існаваньня, аграмаджаная жывёлагадоўля (саўгасы і калгасныя таварныя фэрмы) ужо стварыла значнае стада (2 млн. штук буйной рагатай жывёлы ў жывёлагадоўчых саўгасах, 745 тысяч кароў у таварных калгасных фэрмах, поўмільёна сьвіней саўгасаў Сьвінавода, 250 тысяч сьвінаматак у калгасных фэрмах) і заняла значнае месца ў вырабе таварнага масла. (На 1 ліпеня г. г. малочныя таварныя калгасныя фэрмы і жывёлагадоўчыя саўгасы здалі 680 тыс. пудоў масла).

Савет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) зварачаюць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый на тое, што ў асобе калгасных таварных фэрм і інкубатарных птушніцкіх станцый знойдзена форма стварэньня аграмаджанай жывёлагадоўлі і птушніцтва, якая найбольш адпавядае сучаснай арэцельнай стадыі разьвіцьця калгаснай гаспадаркі і побач з саўгасамі найбольш хутка вырашае задачу стварэньня буйной таварнай жывёлагадоўлі. Гэта форма гаспадаркі дае высокую таварнасьць—каля 70 проц. на малачку і масьле замест 10-20 проц. у аднаасобных гаспадарках і замест 10-30 проц. у звычайным аграмаджаным калгасным стадзе. Гэта форма гаспадаркі заслугоўвае ўсямернага падтрыманьня з боку ўсіх партыйных і савецкіх органаў. Зьяўляючыся адной з выгаднейшых сельска-гаспадарчых галін калгаснай гаспадаркі і разьвіваючыся побач з аднаасобнай спажывецкай жывёлагадоўчай гаспадаркай калгасьнікаў і аграмаджаным стадам у калгасах, калгасныя фэрмы ў далейшым, нясумненна стануць важнейшым вытворнікам таварнай жывёлагадоўчай прадукцыі для дзяржавы.

Побач са значнымі колькаснымі посьпехамі ў галіне разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і таварных фэрм калгасаў, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР адначаюць рэзкае адставаньне якасных показальнікаў: невыстарчальнае кармленьне і дрэнны догляд жывёлы і бестаспадарчасьць у радзе жывёлагадоўчых саўгасаў і некаторае адставаньне ва ўкамплектаваньні стада саўгасаў па лініі Саюзмяса, — акалічнасьці, якія тармозяць выкананьне прынятай урадам праграмы будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў і таварных калгасных фэрм у 1931 годзе.

Шляхам будаўніцтва саўгасаў і калгасаў партыя вырашыла збожжавую праблему і ўжо дабілася рашучых зрухаў у справе разьвіцьця тэхнічных культур (бавоўна, лён, буракі).

Першыя крокі па будаўніцтве сацыялістычнай жывёлагадоўлі (жывёлагадоўчыя саўгасы, калгасныя таварныя, малочныя і сьвінагадоўчыя фэрмы і інкубатарна-птушніцкія станцыі, аграмаджанае стада ў калгасах) паказваюць, што і вырашэньне задачы па ўдзьме жывёлагадоўлі і павялічэньні таварнай жывёлагадоўчай прадукцыі можа быць праведзена толькі тым-жа выпрабаваным шляхам, г. зн. шляхам стварэньня і ўмацаваньня буйной аграмаджанай гаспадаркі па жывёлагадоўлі.

У 1931 годзе павінен быць закладзен цьвёрды фундамант для далейшага шпаркага разьвіцьця сацыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі з тым, каб забясьпечыць і ў гэтай апошняй, пакуль яшчэ слаба аграмаджанай, галіне сельска-гаспадарчай вытворчасьці перамогу сапраўды арганізаванай, мэханізаванай, аснаванай на апошніх дасягненьнях навукі буйной сацыялістычнай гаспадаркі.

У адпаведнасьці з гэтым ЦК партыі і СНК СССР пастанаўляюць:

1. Давесьці стада жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм да канца 1931 году: па **Жывёлаводзе**—да 2.800.000 штук, па **Сьвінаводзе**—1.900.000 штук, па малочных рэспубліканскіх трэстах—да 260.000 кароў, у тым ліку па **Малаканрэсьце РСФСР**--130.000 кароў, па **Маспатрэсьце**—да 180.000 штук (з павялічэньнем супроць пляну на 70.000 кароў), па **«Союзсахары»**—да 140.000 кароў (з павялічэньнем супроць пляну на 50.000 кароў) і да 40.000 сьвінаматак, па **Аўцаводзе**—да 4.800.000 авечак (з павялічэньнем супроць пляну на 800.000 штук), па **Аленяводчым трэсьце** РСФСР—да 200.000 штук, па **птушкатрэстах**—да 3.000.000 штук птушкі, па **Малаканалгасцэнтры**—да 1.500.000 дойных кароў, па **Сьвінаводкалгасцэнтры** — да 700.000 сьвінаматак, па **Інкубатараптушкацэнтры**—да 10.000.000 штук птушкі.

2. Прапанаваць Наркамснабу СССР перадаць саўгасам і таварным калгасным фэрмам да канца 1931 году: 1.700.000 штук буйной рагатай жывёлы, у тым ліку да 1 кастрычніка—1.200.000 штук; цялят і маладняка—2.500.000 штук, у тым ліку да 1 кастрычніка—2.100.000; сьвінаматак—415.000 штук, у тым ліку да 1 кастрычніка 315.000 штук; авечак да 1 кастрычніка — 2.000.000; птушкі здаць да 1 кастрычніка: курэй—570.000 штук, гусей — 75.000 штук, качак — 300.000 штук, забясьпечыўшы строгае выкананьне паквартальных і месячных пляноў камплектаваньня стада.

3. Прапанаваць Калгасцэнтру папоўніць аграмаджанае стада калгасаў ня менш чым на 1,5 млн. цялят, 500 тыс. парасят і 1 млн. ягнят у 1931 годзе і ня менш, чым на 4 млн. цялят, 3 млн. парасят і 2 млн. ягнят у 1932 годзе шляхам куплі праўленьнямі калгасаў маладняка ў сваіх членаў, а таксама шляхам аграмаджаньня часткі прыплоду жывёлы калгасьнікаў.

4. Абавязаць мясцовыя партыйныя арганізацыі і зямельныя органы аказваць усялякую садзейнасьць камплектаваньню стада калгасных жывёлагадоўчых фэрм шляхам вылучэньня калгасамі для гэтых фэрм пэўнай часткі сваёй аграмаджанай жывёлы, а таксама шляхам куплі ў сваіх членаў для фармаваньня стада фэрм кароў і сьвіней і ў асаблівасьці цялят і парасят.

5. Прапанаваць Наркамснабу СССР праводзіць здачу жывёлы саўгасам і калгасным таварным фэрмам пераважна непасрэдна з першапачатковых загатоўчых пунктаў з тым, каб жывёла, якая зататаўляецца Саюзмясам, адпраўлялася ў нагульныя гурты і на забой толькі пасьля агляду гэтай жывёлы і адбору прыгоднай для вытворчых мэт жывёлы на ўкамплектаваньне саўгасаў і калгасных таварных фэрм у лік пляну. Устанавіць тэрміны для адбору жывёлы з загатоўчых пунктаў Саюзмяса прыёмшчыкамі жывёлагадоўчых саўгасаў ад 5 да 8 дзён.

Прапанаваць Наркамснабу СССР на справе забясьпечыць выкананьне ўстаноўленай законам забароны забою племянных кароў і вытворнікаў, прыцягваючы вінаватых у парушэньні гэтага закону да самай строгай адказнасьці.

Абавязаць органы Наркамзему прымаць племянную жывёлу, якая перадаецца загатоўчымі базамі Саюзмяса, для камплектаваньня стада саўгасаў за ўсіх без выключэньня раёнах па-за залежнасьцю ад плянаў камплектаваньня данага раёну.

6. Адзначаючы ненармальна вялікую страту жывёлы, у асаблівасьці маладняка, у жывёлагадоўчых саўгасах за прайшоўшую зіму, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР прапануюць жывёлагадоўчым трэстам, цэнтрам калгасных таварных фэрм, зямельным органам і калгасаюзам прыняць належныя меры да рашучага паляпшэньня догляду жывёлы і да зьніжэньня процанту адыходу ад рознага роду хвароб і нездавальняючага ўтрыманьня жывёлы і дабіцца ў бліжэйшыя гады рашучага павялічэньня тэмпаў прыросту стада саўгасаў і калгасаў.

7. Зацьвердзіць плян вытворчасьці і здачы жывёлагадоўчымі трэстамі і цэнтрамі калгасных таварных фэрм прадукцыі на 1931 год у наступных разьмерах:

а) **па масьле** 34,9 тыс. тон,
у тым ліку: Маслатрэст 3,5 тыс. тон.
Жывёлавод 4,0 тыс. тон.
Рэсп. малочныя трэсты 1,0 тыс. тон.
«Саюзсахар» 3,4 тыс. тон.
Усяго па саўгасах 11,9 тыс. тон.
Таварныя фэрмы Малаканалгасцэнтру (у пераводзе на малако—510.000 тон) 23,0 тыс. тонн.

б) **па мясе** 103,6 тыс. тон,
у тым ліку жывёлавод 48,3 тыс. тон,
Сьвінавод 18,0 тыс. тон.
Аўцавод 8,0 тыс. тон.
Жывёлагадоўч. рэспубл. трэсты і Маслатрэст 6,0 тыс. тон.
«Союзсахар» 18,5 тыс. тон.
Сьвінаводкалгасцэнтр 4,8 тыс. тон.

в) **па воўне:**
Аўцавод 8,0 тыс. тон па дагаворы.

г) па яйках 50,3 тыс. скрынак,
у тым ліку: Птушкатрэсты 5,3 тыс. скрынак.
Інкубатарптушкацэнтр 45,0 тыс. скрынак.

д) **па малаку:**
Рэсп. малажагародзінатрэст 160,0 тыс. тон.

е) па казэіне:
Маслатрэст 1.000,0 тон.

ж) па сыры і брынзе: 5,9 тыс. тон.
у тым ліку:
Маслатрэст 1,0 тыс. тон сыру.
Аўцавод 1,9 тыс. тон брынзы.

8. Зацьвердзіць плян Наркамснабу СССР па адкорме буйной рагатай жывёлы і сьвіней на адкідах харчовай прамысловасьці грамадзкага харчаваньня і прыгарадных гаспадарак на пэрыяд з 1 кастрычніка 1931 году па 1 студзеня 1933 году ў колькасьці 500 тыс. штук буйной рагатай жывёлы і 2.100 тыс. штук сьвіней, у тым ліку ў IV квартале 1931 году буйной рагатай жывёлы 125 тыс. штук, сьвіней 451.200 штук.

9. Адзначаючы вялізарнае значэньне дробнай жывёлагадоўлі (сьвінагадоўля, птушніцтва, трусагадоўля) у справе мяснога забесьпячэньня, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР прапануюць усім мясцовым партыйным, зямельным і калгасным арганізацыям аддаць асаблівую ўвагу разьвіцьцю гэтых скарасьпелых відаў жывёлагадоўлі

Прапанаваць Сьвінаводкалгасцэнтру адкарміць і здаць дзяржаве ў 1932 годзе ня менш 2 млн. штук сьвіней; апрача таго прапанаваць Калгасцэнтру паставіць задачу перад калгасамі, якія ня маюць сьвінагадоўчых і птушніцкіх таварных фэрм, арганізаваць у кожным калгасе калектыўную гадоўлю і калектыўны продаж дзяржаве: ад 10 да 50 сьвіней у адкормленым выглядзе, у залежнасьці ад магутнасьці калгасу, у раёнах аўцагадоўлі—ад 10 да 50 авечак, у раёнах птушніцтва—ад 100 да 500 штук птушкі і ў раёнах трусагадоўлі—ад 100 да 300 трусоў.

Прапанаваць Цэнтрасаюзу паставіць такую-ж задачу перад сельскімі спажывецкімі таварыствамі.

Даручыць Наркамснабу СССР сумесна з Наркамземам, Калгасцэнтрам і Цэнтрасаюзам у двухдзённы тэрмін выназначыць мерапрыемствы па матар'яльным заахвочаньні калгасаў і спажывецкіх таварыстваў, якія з посьпехам выконваюць указанае заданьне.

10. Для забесьпячэньня выкананьня пляну здачы таварнай прадукцыі жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм:

а) абавязаць зямельныя органы ў далейшым яшчэ больш узмацніць устаноўлены імі нагляд за ходам здачы таварнай прадукцыі саўгасамі і таварнымі фэрмамі, няўхільна прыцягваючы дырэктароў саўгасаў і таварных фэрм, вінаватых у разбазарваньні таварнай прадукцыі, да суровай адказнасьці, як за пакражу народнай маемасьці:

б) устанавіць спэцыяльныя прэміі за перавыкананьне пляну здачы прадукцыі паасобнымі саўгасамі і калгаснымі таварнымі фэрмамі як у форме грошавых і натуральных выдач дырэктарам, рабочым і спэцыялістам жывёлагадоўчых саўгасаў, якія перавыканалі плян, так і ў форме прэміяваньня саўгасаў і таварных фэрм у цэлым шляхам водпуску звыш пляну трактараў, машын, а таксама дадатковага водпуску канцэнтраваных кармоў, племянных вытворнікаў і інш.;

в) забясьпечыць у адносінах усіх без выключэньня спэцыялістаў, вышэйшага адміністрацыйнага пэрсаналу і старэйшых рабочых саўгасаў правядзеньне ўстаноўленай Наркамземам СССР сыстэмы павышэньня заработнай платы гэтых катэгорый работнікаў саўгасаў у адпаведнасьці з разьмерамі вытворчасьці і здачы таварнай прадукцыі.

11. Абавязаць ЦК нацкампартыі, краявыя камітэты (абласныя камітэты), СНК саюзных і аўтаномных рэспублік і крайвыканкомы ўстанавіць рэгулярны нагляд за ходам камплектаваньня стада саўгасаў і калгасных таварных фэрм, а таксама за здачай саўгасамі і калгаснымі таварнымі фармамі таварнай прадукцыі і забясьпечыць поўнае і своячасовае выкананьне пляну камплектаваньня стада саўгасаў і таварных калгасных фэрм і выкананьне імі пляну па здачы таварнай прадукцыі.

12. Адзначаючы, што стварэньне моцнай кармавой базы зьяўляецца рашаючай умовай пасьпяховага разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і таварных калгасных фэрм, прапанаваць зямельным органам, калгасаюзам і жывёлагадоўчым трэстам і калгасным цэнтрам поўнасьцю забясьпечыць усё стада жывёлы жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных фэрм уласнымі грубымі і сочнымі кармамі, для чаго ў бягучую сенаўборачную кампанію правесьці ўборку сена ў саўгасах на плошчы ня менш 11 млн. гэкт. і ў калгасах ня менш 30 млн. гэкт. і засілаваць у калгасах і саўгасах ня менш 10 млн. тон сіласу.

13. Прапанаваць Наркамснабу СССР адпусьціць з дзяржаўных фуражных рэсурсаў ураджаю 1931 году Наркомзему СССР для пакрыцьця дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох жывёлагадоўчых саўгасаў Наркамзему і калгасных таварных фэрм:

макухі	18	млн. пуд.
вотрубяй	60	млн. пуд.
збожжавых культур	100	млн. пуд.

у тым ліку для пакрыцьця дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм:

макухі	15	млн. пуд.
вотрубяй	50	млн. пуд.
збожжафуражу ...	93	млн. пуд.

Для пакрыцьця дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох калгасных таварных фэрм, якія ня маюць выстарчальнай колькасьці ўласных канцэнтраваных кармоў, адпусьціць з дзяржаўных рэсурсаў 20 млн. пудоў, у тым ліку:

макухі	3	млн. пуд.
вотрубяй	10	млн. пуд.
збожжафураму	7	млн. пуд.

14 Для ўзмацненьня дзяржаўных рэсурсаў канцэнтраваных кармоў прызнаць неабходным пырокае разгортваньне перапрацоўкі на кармы адкідаў харча-смаковай прамысловасьці, для чаго прапанаваць у 2-ой палове 1931 г. і 1932 годзе:

«Союзсахару» вырабіць 1,5 млн. цэнтн. сухога жому.

Саюзрыбе вырабіць 0,11 млн. цэнтн. рыбнай мукі.

Саюзмясу вырабіць 0,15 млн. цэнтн. «крывяной і мясакосной мукі.

«Крахмалопатачному об'единению» вырабіць 450,0 тыс. цэнтн. кукурузнай мязгі.

Саюзсьпірту вырабіць 70,0 тыс. цэнтн. сухой брагі.

«Бродильному об'единению» вырабіць 100,0 тыс. цэнтн. драбины.

«Бродильному об'единению» вырабіць 50.0 тыс. цэнтн. дрожджаў.

Прызнаць неабходным для забесьпячэньня гэтай праграмы павялічыць аб'ём капітальных затрат па адпаведных галінах прамысловасьці Наркамснабу для утылізацыі адкідаў харчовай прамысловасьці на 27 млн. руб. з асигнаваньнем у бягучым 1931 г. 10 млн. руб. Рэшту сумы прадугледзець у пляне за першае паўгодзьдзе 1932 году.

15. Побач з разгортваньнем камбікармовай прамысловасьці ў сыстэме Наркамзему СССР стварыць у сыстэме Наркамзему СССР спэцыяльны трэст «Комбікормов» для будаўніцтва заводаў і арганізацыі вырабу камбікармоў.

Прапанаваць Наркамснабу СССР і ЦКЗ СССР у дэкадны тэрмін падаць у СПА плян разгортваньня камбікармовай прамысловасьці ў сыстэме Наркаснабу і Наркамзему СССР на 2-ю палову 1931 г. і на 1932 год.

Прапанаваць ВСНГ СССР у месячны тэрмін прыступіць да разгортваньня вырабу абсталяваньня для камбікармовай прамысловасьці і ўтылізацыі адкідаў харчовай і сельскагаспадарчай прамысловасьці.

16. Прапанаваць ВСНГ СССР устанавіць спэцыяльны нагляд за ходам выкананьня ўстаноўленай праграмы будаўніцтва стандартных сіласных вежаў на заводах лясной прамысловасьці і наладзіць забесьпячэньне прадугледжанага ўрадавым плянам сіласнага будаўніцтва неабходным абсталяваньнем і будаўнічымі матар'ёламі.

Прапанаваць Наркамзему СССР арганізаваць у сыстэме «Союзсельстроя» спэцыяльную кантору для кіраўніцтва будаўніцтвам сіласных пабудоў і для тэхнічнага інструктаваньня будаўніцтва сіласных пабудоў, якое ажыцьцяўляецца жывёлагадоўчымі трэстамі і калгаснымі гаспадарчым спосабам, вылучыўшы для гэтай канторы з рэзэрвовага фонду Наркамзему СССР 1 млн. рублёў.

17. Фонд канцэнтраваных кармоў, які вылучаецца згодна данай пастанове для саўгасаў і калгасных таварных фэрм, прапанаваць Наркамснабу адпусьціць у распараджэньне Наркамзему СССР, а выдаткаваньне яго весьці паводле пляну і ўказаньняў Наркамзему СССР, узгодненых з Наркамснабам СССР, пры гэтым павінна быць забясьпечана строгае захаваньне парадку выдачы канцэнтраваных кармоў калгасным таварным фэрмам у залежнасьці ад здачы імі таварнай прадукцыі, згодна заключаным кантрактацыйным дагаворам.

Для спрашчэньня і паляпшэньня парадку атрыманьня кармоў саўгасамі захаваць ва ўсіх раёнах сыстэму прыпіскі саўгасаў непасрэдна да элеватараў, млыноў і алейняў.

18. Адзначыў зусім нездавальняючае выкананьне пляну капітальнага будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах, абавязаць крайкомы (абкомы) і ЦК нацкампартый, «Союзсельстрой», жывёлагадоўчыя трэсты забясьпечыць завяршэньне будаўніцтва ў саўгасах, неабходнага для разьмяшчэньня жывёлы, не пазьней 15 лістапада 1931 году. Для гэтага ўстанавіць рэгулярнае, ня менш і разу ў месяц, заслухоўваньне дакладаў аб ходзе будаўніцтва ў крайкомах (абкомах) і райкомах партыі, усклаўшы на аднаго з членаў бюро крайкомаў і райкомаў сыстэматычны нагляд за выкананьнем пляну капітальнага будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах. Прапанаваць ВСНГ і НКПС закончыць завод будматар'ялаў, асабліва лесаматар'ялаў, адпушчаных жывёлагадоўчым саўгасам па першыя тры кварталы, не пазьней, чым да 1 верасьня г. г.

19. З прычыны таго, што разгортваньне буйной малочнай гаспадаркі ў бягучым годзе сустракае значныя перашкоды з-за недахвату спэцыяльнага малочнага інвэнтару для транспартаваньня малака (флягі, бідоны і г.д.), абавязаць ВСНГ СССР і Усекампрамсаюз разарынуць выраб гэтага начыньня і інвэнтару ў неабходных разьмерах для забесьпячэньня захаваньнасьці і дастаўкі макака на пераапрацоўчыя і спажывецкія пункты, скарыстоўваючы для гэтага ў першую чаргу саматужную прамысловасьць.

20. Для забесьпячэньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм належнымі кадрамі кіруючых работнікаў і спэцыялістаў, прапанаваць жывёлагадоўчым трэстам і Калгасцэнтру СССР:

а) давесьці ў 1932 годзе ў кожным саўгасе лік спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі да 6-8 чалавек і сярэдняй кваліфікацыі да 15-20 чалавек і ў кожнай калгаснай таварнай фэрме да 2-3 спэцыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі як шляхам разгортваньня адпаведнай сеткі ВНУ і тэхнікумаў, так і шляхам падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі праз курсавую сетку;

б) арганізаваць у сыстэме жывёлагадоўчых трэстаў і калгасных цэнтраў шырокую сетку кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы (старшых гуртаправаў, скотнікаў, даярак, чабанаў, сьвінароў, птушнікаў, ветэрынарных фельчароў і г. д.);

в) абавязаць крайкомы, абкомы і ЦК нацкампартый у дэкадны тэрмін супольна з праўленьнямі жывёлагадоўчых трэстаў пераглядзець увесь склад упаўнаважаных трэстаў і спэцыяльных калгасных цэнтраў, маючы на ўвазе неабходнасьць падбору людзей, якія са праўды ведаюць і могуць забясьпечыць паляпшэньне пастаноўкі справы;

г) аддзелу кадраў ЦК УсеКП(б) у месячны тэрмін перадаць Наркамзему СССР для ўмацаваньня кадраў жывёлагадоўчых саўгасаў Жывёлавода, Сьвінавода, Аўцавода, Маслатрэсту неабходную колькасьць работнікаў для замяшчэньня пасад дырэктароў і нам. дырэктароў новаарганізаваных саўгасаў і ўмацаваньня старых саўгасаў;

д) у адпаведнасьці з тым, што розныя мясцовых органаў і іх адказнасьць за разультаты разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі ўсё больш узмацняюцца, у асаблівасьці ў галіне будаўніцтва, фармаваньня стада і здачы таварнай прадукцыі, прызнаць правільным праведзенае НКЗ СССР пашырэньне правоў абласных упаўнаважаных жывёлагадоўчых трэстаў і перадачу імі раду апэрацыйных функцый. Ухваліць пастанову НКЗ СССР ад 14 мая, якая вызначыла пашырэньне правоў упаўнаважаных трэстаў;

21. Для забесьпячэньня разгортваньня аграмаджанай жывёлагадоўлі ў нацыянальных жывёлагадоўчых раёнах (сяр. азіяцкія рэспублікі, Казахстан Кіргізія, Бурата-Манголія, Кара-Калпакія, Дагестан, Калмыкія) даручыць Наркамснабу і Наркамзему СССР супольна з урадамі ўказаных рэспублік і абласцей пры ажыцьцяўленьні пляну збожжазагатовак, складаньні пляну пасеўнай кампаніі, пляну мясазагатовак і пры распрацоўцы мерапрыемстваў па асяданьні вандроўнага насельніцтва забясьпечыць правядзеньне мер, якія спрыяюць разьвіцьцё таварнай жывёлагадоўлі ў гэтых раёнах:

а) прадугледзець далейшае шырокае разьвіцьцё машына-сенакосных станцый ў гэтых раёнах з давядзеньнем іх ліку ў 1932 г. ня менш, чым да 350

б) разгортваньне дапаможных, спа жывецкага характару, пасеваў збожжавых культур і гародніны ў раёнах якія да цяперашняга часу зьяўляюцца выключна жывёлагадоўчымі;

в) узмацненьне забесьпячэньня гэтых раёнаў мануфактурай, абуткам і іншымі таварамі, якія выраблюцца па месцы са скуры і воўны;

г) пры кантрактацыі жывёлы ў гэтых раёнах прадугледзець забесьпячэньне неабходнага фонду збожжа ў парадку кантрактацыі, аналёгічна таму, як гэта мае месца ў адносінах тэхнічных культур;

д) канчатковую ліквідацыю на працягу бліжэйшых 2-3 год асабліва пагубных для вандроўнай жывёлагадоўлі эпізоатыі;

е) узмацненьне мерапрыемстваў па павышэньні кваліфікацыі рабочых кадраў жывёлагадоўчых саўгасаў (гуртаправы, чабаны і г. д.), якія фармуюцца з мясцовага насельніцтва шляхам арганізацыі сеткі кароткатэрміновых курсаў і тэхнікумаў у гэтых раёнах.

22. У мэтах стварэньня ўстойлівай сырцовай базы для ўдасканаленых мясных камбінатаў, якія будуюцца ў буйных спажываючых цэнтрах і ў асноўных жывёлагадоўчых вытворчых раёнах, прапанаваць НКЗему СССР:

а) забясьпечыць разгортваньне неабходнай сеткі жывёлагадоўчых саўгасаў у раёнах будаўніцтва мясакамбінатаў (Ленінградская, Маскоўская, Уральская вобласьці, Сібір і г. д.);

б) забясьпечыць здачу па мясакамбінаты ў 1933 годзе ня менш 6 млн. штук сьвіней саўгасамі Сьвінавода і ня менш 7 млн. штук калгаснымі сьвінагадоўчымі фэрмамі і ў цэлым 80 проц патрэбнасьці мясакамбінатаў і ў 1935 годзе паступленьне з саўгасаў Сьвінавода і калгасных сьвінагадоўчых таварных фэрм на тыя-ж камбінаты ня менш 15 млн. штук сьвіней;

в) забясьпечыць здачу саўгасамі Жывёлавода на мясакамбінаты ў 1933 г. ня менш 1 млн. штук і ў 1935 г. ня менш 1 млн. штук і ў 1935 г.—1,6 млн. штук, што павінна складсьці ня менш 1/3 вытворчай магутнасьці мясакамбінатаў;

г) забясьпечыць паступленьне з саўгасаў Аўцавода на мясакамбінаты ў 1933 г. ня менш 1,8 млн. штук авец і ў 1935 г. ня менш 3 млн. штук, што павінна складсьці каля 2/3 нагрузкі мясакамбінатаў.

23. Даручыць СПА не пазьней 1 гэтага жніўня забясьпечыць адпаведным фінансаваньнем у 3 і 4 кварталах праграму разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм у разьмерах, неабходных для выкананьня ўсёй праграмы, намечанай гэтай пастановай.

24. Ухваліць пастанову НКЗ СССР і Калгасцэнтру аб павялічэньні, у адпаведнасьці з данай пастановай, разьмераў крэдытаваньня Малкалгасцэнтру да 165 млн. рублёў, Сьвінаводкалгасцэнтру да 55 млн. руб., Інкубатараптушкацэнтру да 38 млн. рублёў і асигнаваньня аўцаводчым калгасным фэрмам 18 млн. рублёў шляхам пераразьмеркаваньня адпушчаных Наркамзему СССР фондаў доўгатэрміновага крэдытаваньня і за кошт рэзэрву фонду доўгатэрміновага крэдытаваньня.

Старшыня СНК СССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН)
Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН

30 ліпеня 1931 г.

ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

(Да вынікаў V пленуму ЦКК КП(б)Б)

«Грандыёзны разварот сацыялістычнага будаўніцтва стварыў зараз па стыку першага і другога паўгодзьдзяў рашаючага году пяцігодкі новую абстаноўку і высунуў новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва» («Правда»).

У пачатку гэтага **новага пэрыяду** праводзіў сваю работу V пленум ЦКК КП(б)Б.

Утвораныя Леніным органы ЦКК-РСІ заўсёды былі моцнай і вернай зброяй партыі, таму, зразумела, у аснову работы пленуму былі пакладзены пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), ліпеньскага пленуму ЦКК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, кіраўнічыя ўказаньні тав. Сталіна.

ЦКК-РСІ зьяўляецца кіраўніком і арганізатарам праверкі работы ўсіх зьвеньняў дзяржаўнага, каапэрацыйнага, савецкага апарату, апарату пралетарскай дыктатуры. Указаньне тав. Леніна — **«праверка выкананьня — гвоздь работы»** — захоўвае ўсю сваю сілу і зараз, на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. Але **новыя** ўмовы, **новая** абстаноўка патрабуюць ад нас некалькі зьмяніць характар, мэтады і формы праверкі выкананьня. Гэта, бясспрэчна, **ня значыць**, што мы пераглядаем, рэвізуем устаноўкі Леніна аб рабоце органаў КК-РСІ. Але гэта значыць, што ЦКК-РСІ ў новай абстаноўцы **павінна працаваць па-новаму**, перабудаваць работу сваіх органаў так, каб яна спрыяла хутчайшай рэалізацыі задач, якія перад партыяй паставіў тав. Сталін у сваёй апошняй прамове.

Работа **па-новаму** патрабуе, як гаворыцца ў рэзалюцыі III пленуму ЦКК УсеКП(б), каб **«кожны кіраўнік прадпрыемства ня толькі ведаў дакладна агульнае становішча кожнага цэху, але і кіраваў-бы працэсамі вытворчасьці, аўладаючы тэхнікай вытворчасьці і ведаючы канкрэтныя недахопы ў рабоце, ад якіх залежыць затрыманьне ў выкананьні вытворчай праграмы і прамфінпляну».**

На аснове гэтага пленум ЦКК УсеКП(б) прапанаваў усім КК-РСІ кіравацца ў сваёй штодзённай рабоце тым, што **«барацьба за такое канкрэтнае кіраўніцтва павінна стаць асноўным зьместам работы органаў КК-РСІ на мясцох пры праверцы работы таго ці іншага прадпрыемства ці ўстановы».**

Гэта ўказаньне знайшло свой адбітак ва ўсёй рабоце пленуму ЦКК КП(б)Б; у пастановах аб рэканструкцыі і рацыяналізацыі транспарту, аб падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак, аб рабоце парткалегіі ЦКК, аб далейшым разгортваньні самакрытыкі і ў іншых пытаньнях, якія разглядаў пленум.

Робячы ўпор на праверцы выкананьне, патрабуючы ад усіх гаспадарнікаў, кіраўнікоў савецкіх, каапэрацыйных, гаспадарчых арганізацый арганізацыі праверкі выкананьня ўнутры кожнай арганізацыі, забесьпячэньня кантролю па сутнасьці, пленум ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае неабходнасьць **узьняцьця якасьці ўсёй работы па праверцы, масавасьці ва ўсёй рабоце органаў КК-РСІ,** «ставіць бліжэйшай задачай дабіцца пералому ў справе ўцягненьня ва ўсю работу РСІ прафсаюзаў і камсамолу, значнага пашырэньня і паляпшэньня органаў масавага кантролю (ЧКК, ЧКБ, групы садзейнасьці, «ЛК», шэфскія брыгады) і ўздыму ролі прафсаюзаў і камсамолу ў правядзеньні разгорнутага наступленьня па бюракратызм, рацыяналізацыі апарату і пастаноўкі масавай праверкі выкананьня».

Ва ўсіх пастановах пленуму ЦКК чырвонай ніткай праходзіць патрабаваньне аб скарачэньні ўсякай мітусьні пасяджэньняў, **Мінімум абсьледваньняў, максымум канкрэтнасьці** ў праверцы выкананьня, вылучэньне галоўных рашаючых пытаньняў — гэта патрабаваньне III пленуму ЦКК УсеКП(б) прад'явіў да сябе пленум ЦКК КП(б)Б, да ўсіх сваіх органаў на мясцох, робячы ўпор на неабходнасьць узьняцьця кваліфікацыі работнікаў КК-РСІ.

«Пленум прапануе КК упарадкаваць работу свайго апарату, значна скараціць аб'ём і колькасьць усякіх дакладных запісак, вынікаў, пастаноў, скараціць розныя пасяджэньні і арганізаваць больш рацыянальнае скарыстаньне рабочага дня ў рабоце ўсіх зьвеньняў партыйнага, гаспадарчага і іншых апаратаў, выкарыстоўваючы пэўную частку часу на самападрыхтоўку і ўздым кваліфікацыі і аўладаньне тэхнікай актывам і асабліва работнікамі КК-РСІ».

Пленум завастрыў увагу на неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы з бюракратызмам у апараце, барацьбы за спрашчэньне і паляпшэньне апарату. Пленум у выкананьне пастановы ЦКК УсеКП(б) аб савецкім апараце прыняў рад мерапрыемстваў, якія накіраваны ня толькі на выключэньне з апарату элемэнтаў, якія разлажыліся і абюракраціліся, але і на **«праверку апарату па сутнасьці яго работы, праверку кіруючых работнікаў, уменьне іх перабудаваць кіраўніцтва па-новаму, у адпаведнасьці з новай абстаноўкай».**

Не раскідвацца, а заўсёды канцэнтраваць работу на галоўным, уменьне злучаць так званыя «дробязі» і буйныя праблемы, кожную пачатую справу даводзіць да канца — гэтыя першачарговыя правілы пленум ЦКК УсеКП(б) паставіў як абавязковы для ўсіх органаў КК-РСІ. «У рабоце па арганізацыі савецкага апарату органы КК-РСІ павінны выходзіць з таго, каб ня браць на сябе задач неадкладнага ўсеагульнага палягшэньня ўсяго савецкага і гаспадарчага апарату, а сканцэнтраваць сваю работу на пасобных вучастках».

Прынята пастанова аб рэалізацыі важнейшай задачы, якую паставіў пленум ЦКК УсеКП(б) аб тым, каб на бліжэйшы пэрыяд сканцэнтраваць усю работу органаў КК-РСІ на праверцы **спажывецкай каапэрацыі і органаў Наркамснабу.**

Рэжым эканоміі — адна з асноўных і важнейшых задач органаў КК-РСІ. На гэтым вучастку дасягнут рад бясспрэчных посьпехаў, але новая абстаноўка патрабуе ад органаў КК-РСІ яшчэ больш жорсткай барацьбы за эканомію, за сацыялістычнае накапленьне, якое павінна забясьпечыць яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. **«Ключ да новых крыніц накапленьня на даным этапе—гаспадарчы разрахунак».** Таму пленум даў жорсткую дырэктыву ўсім сваім органам і ўсім работнікам: **«Узяць пад неаслабны кантроль пытаньне аб барацьбе з «излишествами», узмацненьні ўнутрыпрамысловага накапленьня, скарачэньні накладных выдаткаў у прамысловас

НА АСНОВЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ПРАВІЛЬНАГА УЛІКУ ПРАЦЫ

Барацьба за торф

УСЕСАЮЗНЫ РЭКОРД

па здабычы торфу паказваюць брыгады Воранава, Волкава, Заікіна і Маслава

АДСУТНАСЬЦЬ БАЛЬШАВІЦКАГА КІРАЎНІЦТВА НА АСІНТОРФЕ СТАВІЦЬ ПАД ПАГРОЗУ НАРМАЛЬНУЮ РАБОТУ БЕЛДРЭСУ

Становішча Асінторфу патрабуе тэрміновага ўмяшаньня ЦКК-НК РСІ

Гэроі бальшавіцкіх тэмпаў

ГОМЕЛЬ, 30.

Пастанова ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках выклікала новы ўздым энтузіязму на торфазаводах Гомельшчыны.

На заводзе „Давыдаўка" ўсе чатыры брыгады перавыконваюць свае заданьні. Брыгада тав. **Масловай** давяла дзенную выпрацоўку да **62.600 цаглін** пры дзенным заданьні **35.000 цаглін**.

На заводзе **„Бальшавік"** брыгада **Барановаой** дала рэкордныя лічбы па пераварочваньні торфу. Пры норме 7.000 цаглін на адну работніцу, што складае дзеннае брыгаднае заданьне **ў 98.000 цаглін**, брыгада тав. Воранавай дала **245.800 цаглін**.

Наперадзе ідуць брыгадзіршы **Воранова, Волкава, Заікіна**, якія выпрацоўваюць па 21.800 цаглін кожная, што складае 311 проц. заданьня.

Узмацніць кіраўніцтва Асінторфу

Апошняя пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб торфараспрацоўках не прапрацавана і не даведзена да рабочага-тарфяніка Асінторфу. Кіраўніцтва Асінторфу не разгарнула вакол гэтага дакумэнту адпаведнай масавай работы, не мабілізавала масы тарфяннікаў на ліквідацыю прарыву. У выніку—да апошніх дзён няма належнага эруху ў здабычы торфу.

Абураючыя адносіны прыняла адміністрацыя Асінторфу да прыбыўшых рабочых на дапамогу ў ліквідацыі прарыву. На другі дзень пасьля пастановы ЦК і СНК аб торфараспрацоўках на Асінторфе прыбыла 1.200 рабочых для пралетарскай дапамогі тарфяннікам. Ня гледзячы на тое, што адміністрацыя была папярэджана аб гэтым, яна ніякіх мер не прыняла да прыёму гэтай рабочай сілы. **1.200 рабочых два дні хадзілі без работы.** Адміністрацыя не наладзіла правільнай расстаноўкі рабочай сілы, не наладзіла ўліку работы і г. д.

Пастанова ЦК і СНК БССР ня выконваецца

Да апошняга дня ня выкананы 7-мы пункт пастановы ЦК і СНК БССР аб пераводзе здабычы торфу на круглясутачную работу, не прыступілі да выкананьня 9-га пункту аб укараненьні гаспадарчага разрахунку, аб давядзеньні яго да машыны, цэху і брыгады. **Не прымацаваны да машын рахункаводы, не забяспечана ніквідацыя прарываў у сушцы торфу, ня пушчан яшчэ торфазбіральнік, не забяспечана вывазка 300 вагонэтак торфу ў суткі (вывозіцца ад 170 да 200), не перакінуты да Асінторфу 2-3 лябёдкі для мэханізацыі падвозкі і шмат іншых мерапрыемстваў, правядзеньне якіх залежыць ад энергіі і напорыстасьці мясцовых кіруючых арганізацый.**

Вось чаму сэзоннае заданьне па здабычы торфу на 29 ліпеня Асінторф выканаў на 34,9 проц.

Прэмія... за невыкананьне пляну

Высьветлілася, што сыстэма аплаты і прэміяваньне на Асінторфе спрыяе... невыкананьню прамфінпляну.

Згодна калектыўнага дагавору кожны сэзонны рабочы, які прапрацаваў на Асінторфе ўвесь сэзон і выканаў прамфінплян, атрымлівае прэмію 10 проц., а той, які ня выканаў прамфінпляну,—5 проц.

Пры машыне № 4 працуе замест 32 чалавек 18. Гэтыя 18 сваё заданьне перавыконваюць, але яны ня прымаюць новых рабочых да поўнай зьмены, не жадаюць вучыць новых рабочых, не жадаюць забяспечыць поўнага выкананьня прамфінпляну агрэгатам, а здзекальваюцца сваёй выпрацоўкай і прэміяй, якую яны атрымліваюць за... няпоўную нагрузку агрэгату.

Брыгаду Адошкіна прэміявалі... за яе ўласныя грошы

На Асінторфе ёсьць шмат ударных брыгад, якія перавыконваюць заданьні ўсяго агрэгату, але вопыту іх працы не пашыраюць на іншыя брыгады, якія адстаюць.

Метад прэміяваньня лепшых брыгад нікуды ня варты. Прэміяваньне праводзілася **сакрэтным парадкам** без абмеркаваньня вакол гэтага мерапрыемства шырокай думкі рабочых, без удзеньня ў сацсаборніцтва і ўдарніцтва усіх рабочых, усіх агрэгатаў. Толькі за апошнія дні была праведзена першая спроба перадачы вопыту лепшых адстаючым брыгадам.

Меліся выпадкі, калі лепшую брыгаду Асінторфу тав. **АДОШКІНА** «прэміявалі» за яе ўласныя грошы, г. зн. што рачей ім выдалі прэмію, а потым вылічвалі за выданую прэмію грошы.

Баявыя задачы Асінторфу

Для выкананьня прамфінпляну Асінторфу неабходна дабіцца штодзённай выпрацоўкі каля 4 тыс. тон торфу.

Але адсутнасьць цьвёрдай гаспадарчай рукі, сапраўды бальшавіцкага кіраўніцтва на Асінторфе, дзе важнейшая пастанова партыі і ўраду ня прыводзіцца ў канкрэтнае дзеяньне, ставіць пад пагрозу забяспячэньне БелДРЭСУ на зіму апалам.

Неабходна прыняць рад самых рашучых мер для стварэньня належнага пералому на Асінторфе, каб забяспечыць выкананьне прамфінпляну ў здабычы 121 тыс. тон торфу.

Патрэбна неадкладна пусьціць у ход 12-ю машыну, перавесьці на 3-зьменную работу тры агрэгаты, абсталяваньня ўжо асьвятленьнем, і забяспечыць перавод усіх іншых агрэгатаў на 3-зьменную работу да 10 жніўня.

Поўнасьцю ўкамплектаваць рабочыя брыгады па агрэгатах з ліку новапрыбываючай рабочай сілы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на адпаведны падбор людзей.

Неабходна тэрмінова распрацаваць і ажыцьцявіць новую сыстэму аплаты па прынцыпе прагрэсыўнай зьдзельшчыны, якая-б стымулявала перавыкананьне прамфінпляну кожным рабочым у паасобку і ўсёй брыгадай, усім агрэгатам у цэлым.

Неабходна тэрмінова зьнішчыць абязьлічку ў рамонце торфагрэгатаў, прымацаваўшы да кожнай групы машын адпаведныя брыгады сьпесараў, якія сачылі-б за іх рамонтам.

Фрэзэрную здабычу торфу, траба ўсямерна пашырыць для чаго зараз-жа распачаць падрыхтоўку новай плошчы балота прыблізна ў 60 гэкт. Траба забяспечыць Асінторф 5 трактарамі з дыскавымі баронамі і 5 павозкамі з шырокімі абадамі для вывазкі вясны.

У тэрміновым парадку патрэбна заняцца плянаваньнем работ, увязваўшы здабычу торфу з яго асушкай і вывазкай.

Для павялічэньня адгрузкі торфу неабходна давесьці пагрузачныя брыгады да 50 чалавек і перавесьці іх на круглясутачную работу і забяспечыць Асінторф дадатковай рабочай сілай у 600-700 чалавек, каб дабіцца павялічэньня сушкі і падрыхтоўкі балот для здабычы фрэзэрнага торфу.

Для новапрыбываючых рабочых на дапамогу ліквідацыі прарыву патрэбна скончыць пабудову 2-3 баракаў.

Апрача гэтага трэба забяспечыць торфрабкон Асінторфу прамтаварамі, палепшыць грамадзкае харчаваньне, каб спыніць цякучасьць рабочай сілы і прыняць рад іншых мерапрыемстваў па паляпшэньні бытавых умоў рабочых Асінторфу.

ПРЫ ШЫРОКІМ РАЗГОРТВАНЬНІ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНІ ВЫЗНАЧАНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ГІСТАРЫЧНЫМ АРТЫКУЛАМ тав. СТАЛІНА, І ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК БССР, БУДЗЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ АСІНТОРФУ.

121.000 ТОН ТОРФУ БелДРЭС ПАВІННА АТРЫМАЦЬ.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ».

„Чырвоная Бярэзіна"

пераведзена на 6-дзеўны тыдзень

НОВА-БАРЫСАЎ, 27. (БЕЛТА). У выніку прапрацоўкі прамовы тав. Сталіна, рабочымі накатнага і ўпаковачнага цэхаў фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» высунута пытаньне аб пераводзе фабрыкі на 6-дзеўны тыдзень, устанавіўшы гэтым цьвёрдыя зьмены. Гэта думка заводскіх кіраўніцтваў праведзена ў жыцьцё.

Аўтаматчыкі на сваім цэхавым сходзе ўнесьлі прапанову аб далейшай самакантрактацыі рабочых за вытворчасьцю. Шырока абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў. Асаблівая ўвага зьвернута на запалкавы фабзавуч.

Рабочыя і работніцы аўтаматнага, упаковачнага і накатнага цэхаў прапануюць заводакіраўніцтву перавесьці ўсе цэхі на прэміяльна - прагрэсыўную сыстэму зьдзельшчыны, што павінна зацікавіць усіх рабочых да перавыкананьня сваіх норм.

К.

КАЛГАСЫ РАГАЧОЎСКАГА, СТАРАДАРОСКАГА І ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНАЎ

СКОНЧЫЛІ ЖНІВО АЗІМЫХ І УШЧЫЛЬНЯЮЦЬ ТЭРМІНЫ ЎБОРАЧНАЙ

Раўняючыся па гэтых калгасах, дабіцца сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў ва ўборцы ўраджаю

Па-ўдарнаму правялі ўборку жыта

ЦЕРАХАЎКА, 1-VIII. (БЕЛТА). Калгас «Шлях сацыялізму», Церахаўскага раёну, у часе вясновай сяўбы меў значныя прарывы.

На ўборку сена і жніва калгас выйшаў працаваць па-ўдарнаму і выключна на аснове зьдзельшчыны. **Плошча сенажаці ў 300 га і 75 га жнёвышны была скошана і ўбрана да 26 ліпеня. 400 га жыта ўбрана таксама да 26 ліпеня.**

Зараз калгасам распачат абмалот. Калгасьнікі рыхтуюцца да здачы дзяржаве ліпкаў збожжа.

У большасьці новых калгасаў пасевы аграмаджаны

БЯЛЫНІЧЫ. На ўсім раёне распачалася ўборка збожжа. Калгасы «Храбры ерэтыр» і «Праўда», Ланьмоўскага сельсавету, узялі на сябе абавязак—датэрмінова скончыць уборку. Да ўсіх машын прымацаваны брыгады, поўныя калгасьнікі. Уся работа ў гэтых калгасах праводзіцца на аснове зьдзельшчыны. Абязьлічка поўнасьцю ліквідавана.

Большасьць калгасаў, якія арганізаваліся ў часе другой бальшавіцкай вясны, поўнасьцю аграмаждзілі пасевы.

Меліхаў.

Калгас імя Сталіна паказаў бальшавіцкія тэмпы

РАГАЧОЎ. Калгас імя **Сталіна, Зяпольнага сельсавету**, сваячасова падрыхтаваўся да ўборачнай кампаніі. Да выхаду ў поле праўленьне калгасу правяло шырокую работу сярод калгасьнікаў. Сельска-гаспадарчыя машыны былі загадзя адрамантаваны, усе галіны работ пераведзены на зьдзельшчыну, калгасьнікі разьбіты па брыгадах.

Своячасовая падрыхтоўка забясьпечыла пасьпяховае правядзеньне ўборкі сена і азімага жыта.

Уборка сена была поўнасьцю скончана 21 ліпеня. Узорную праўду паказала брыгада касцоў па чале з брыгадзірам Чумаковым, якая штодзённа перавыконвала нормы выпрацоўкі на 50 проц.

Такімі-ж ударнымі тэмпамі калгас прыступіў да ўборкі азімых і яравых. **4 жнівеньскі, якія ёсьць у калгасе, працуюць у дзьве зьмены. Усе калгасьнікі мабілізаваны на вясьнёне снопаў, у выніку чаго за 6 дзён зжата ўсё жыта на 130 га.**

З 29 ліпеня калгас пераключыўся на ўборку яравых культур і прыступіў да малацьбы азімых.

Правільная разстаноўка сіл забясьпечыла і своячасовую праполку 7 гэктараў гародніны, 12 гэктараў ільну. Адначасова ўдарным тэмпам праведзена будаўніцтва аборы на 200 штук прадукцыйнай жывёлы.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партячэйкі, на чале якое стаіць «25-тысячнік» тав. Лосеў.

САЛАДУХІН.

Калгас „Рэс" у радох перадавых

СТАРЫЯ-ДАРОГІ. Калгас «Рэс» паказае бальшавіцкія тэмпы ўборкі. На 30 ліпеня калгасам скошана 290 гэкт. сенажаці, сабрана і складзена ў стагі 25 тыс. пудоў сена. **Уборка сенажацяй скончана.**

Разгорнута ўборка жыта. **На 30 ліпеня ўбрана 180 гэкт.** Такія вынікі дала зьдзельшчына.

Пасьля прапрацоўкі пастановы Наркамзему і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні даходаў калгасьнікі поўнасьцю аграмаждзілі ўсё збожжа.

Калгас прыступіў да малацьбы збожжа.

Узорныя прыклады ўдарнай працы паказалі калгасьнікі Мацько, Хадароўскі, Сасноўскі, Мяжэйч, Хадароўская Марына, Сасноўская Наташа і Куніца Арына.

За час сяўбы і ўборачнай кампаніі ў калгас уліўся новы 52 бядняцка-сераднякоўскія гаспадаркі.

Шашко.

Жніво ў прыгарадным (каля Менску) калгасе імя 1-ай конай арміі

Важнейшая дырэктыва СНК і ЦСПСБ яшчэ ня выканана

Правільная пастаноўка ўліку ў калгасах, поўны перавод калгасаў на зьдзельшчыну зьяўляюцца адным з важнейшых умоў пасьпяховага правядзеньня ўборачнай і асенняй пасеўнай кампаніі. Аб гэтым мы маем неадназначныя указаньні і партыі, і ўраду.

ЦСПСБ на сваім прэзыдыуме яшчэ 14-VII вынес пастанову аб камандыраваньні ў парадку прафсаюзнай дысцыпліны 300 працаўнікоў у калгасы для арганізацыі і замацаваньня гэтай работы. У гэтым ліку 75 чалавек павінны **былі даць Менск, Віцебск, Гомель.** СНК ухваліў гэту пастанову і вылучыў сродкі для гэтай работы. З таго часу **прайшло ўжо 2 з пал. тыдні. Як-жа гэта дырэктыва выконваецца?**

Вось лічбы і факты.

Віцебскі гарпрафсавет адмовіўся зусім камандыраваць каго-б там ні было. Таму, бачыце, што ён мабілізаваў ужо 120 чалавек для «свайго» Віцебскага раёну.

Як стаіць справа ў Гомелі—мы ня ведаем, бо АРУ ўжо 1 з пал. тыдні ўсё ўхіляецца накіраваць туды працаўніка для правядзеньня гэтай работы.

З Менску гарпрафсаветам да гэтага часу былі накіраваны ў Калгасцэнтр толькі 9 чалавек замест 25. Траба сказаць, што тут праяўляецца ўпартае нежаданьне раду адміністратараў адпусьціць свайго працаўніка не таму, што ў іх ёсьць мала працаўнікаў, а таму, што некаторыя ўстановы расцэньвалі амаль палову сваіх працаўнікоў у адзін тэрмін у адпачынак.

Траба рашуча ўдарыць на бюракратаў, апартуністаў, якія зрываюць выкананьне важнейшых дырэктыў.

Дырэктыва СНК і ЦСПСБ павінна быць выкананая.

А. ВАЙЦОК.

Раёны ўключаюцца у месячнік генэральнай праверкі

Уключыліся ў месячнік генэральнай праверкі наступныя раёны: **Плешчаніцкі, Мазырскі, Лагойскі, Талачынскі, Бабруйскі і Вушацкі.**

Мабілізован актыў і пасланы ў сельскія саветы.

Райгазэта «Калгасьнік Талачыншчыны», а таксама райгазэта Лагойшчыны ўключыліся ў месячнік генэральнай праверкі.

Грамадзкасьць на штурм шкоднікаў гародніны!

Капуста, турнэпс, бручка і радыска пад пагрозай поўнага зьнішчэньня шкоднікамі

Ва ўсіх раёнах БССР, прыблізна 27-28 ліпеня спачатку на турнэпсе, а потым на радысцы і бручцы ў масавай колькасьці **зьявіўся рапсавы пілільшчык**, які зараз пераходзіць ужо і на капусту і **зьнішчае цэлыя плошчы гародніны.** Рапсавы пілільшчык зьнішчае пераважна крыжацьветныя, зьнішчае дагэнту. Зьедзенае лісьцё засыхае. Засыхае і корань. Знадворны выгляд чарвы шкодніка рапсавага пілільшчыка цёмна-зялёнага колеру. Ён спачатку праграызае дзіркі на лісьцях, а потым зьядае іх зусім, пакідаючы толькі жылкі. Меры барацьбы з ім—гэта апырсканьне парыскай зялёнай мыльнай вадой: 16 грам на вядро вады з дадаткам 32 грам сьвежа гашанай вапны, каб не апаліць расьлін.

Ня дрэнна фтористым натрам—80-100 грам на вядро вады; фтористым барыем па вядро вады—400 грам, дадаючы 50 грам соды. Джыпсія—20 грам на вядро вады.

Для лепшага прыліпаньня раствору да капусты, якая мае ліст васкавідны, трэба дадаваць клейстэру з разьліку 100 грам мукі на вядро вады.

Можна замест апырсканьня рабіць апыленьне парыскай зялёнай, мышакова-кіслым кальцыем з разьліку і частка вышэйназваных ядаў на 10 частак сьвежа гашанай вапны, ці попелу.

Праз тыдзень чакаецца капустная бляшка. Усе атруты для барацьбы са шкоднікамі ёсьць ва ўсіх раёнах.

Бел. АБШ пры Наркамземе разасла ўсім гаспадарчым сыстэмам і райвыканкамам рад паведамленьняў аб шкодніках з указаньнем мер барацьбы з імі.

Віцебскі зьнішчальны пункт АБШ па даговоры з гарадзкім камітэтам камсамолу мабілізаваў 400 чалавек. Па аддзеленьнях таксама мабілізуюцца масавыя брыгады камсамолу і Асавіяхіму.

Паводле вестак з месц, кадраў не хапае. Для таго, каб зьберагчы гародніну і капусту, як кармовы сродак, бручку, турнэпс і радыску, неабходна мабілізаваць усе грамадзкія сілы на дружнае выступленьне супроць масавага шкодніка—рапсавага пілільшчыка.

АБШ пры Наркамземе Беларусі.

Саўгас „Добрынь" скончыў уборку і абмалот азімых

ЕЛЬСК. Саўгас «ДАБРЫНЬ», Ельскага раёну, скончыў уборку сенажацяй. Скошана 189 гэкт. сенажаці і 65 гэкт. шматгадовых траў.

29 ЛІПЕНЯ САЎГАС СКОНЧЫЎ ТАКСАМА ЎБОРКУ АЗІМЫХ І АБМАЛОТ.

Гэтых посьпехаў саўгас дасягнуў дзякуючы пераводу ўсіх работ НА ЗЬДЗЕЛЬНА-ПРЭМЯЛЬНУЮ АПЛАТУ ПРАЦЫ І РАЗГОРТВАНЬНЮ ЎДАРНІЦТВА.

Зараз у саўгасе **РАЗГАРНУЛАСЯ ЛУЧШЭНЬНЕ ГЛЕБЫ.**

Дырэктар саўгасу ГОЕЎ.
Старшыня рабкому ГУБАРОЎ.

Прыступілі да абмалоту

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. Калгас «Прагрэс», Сіманіцкага сельсавету, ударнымі тэмпамі прыступіў да ўборкі ўраджаю. Убрана 40 га жыта. Калгас адрамантаваў малатарні і пачынае малаціць.

К.

НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ГАЗЭТ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ

Нарада рэдактараў газэт ільнаводчых раёнаў БССР, скліканая Культпропам ЦК КП(б)Б, прайшла пад знакам апэрацыйнай праверкі работы друку ў барацьбе за тэхнічныя культуры.

У дакладах т. т. Паніматні і Стрэле, «Калгасьніка Беларусі» і «Чырвонай Зьмены», горацкай і пепельскай раённых газэт, а таксама ў выступленьнях прадстаўнікоў Наркамзему, Калгасцэнтру і ільнаканапляводчых арганізацый і ўстаноў СССР і БССР былі выразна вызначаны задачы друку ў барацьбе за ліён, за пасьпяховую і своячасовую ўборку і апрацоўку тэхкультур.

Нарада з усёй вострасьцю паставіла пытаньне аб рашучай ліквідацыі абязьлічкі ў рабоце апаратаў газэт. Комны супрацоўнік газэты павінен адказваць за поўны вучастак работы для таго, каб мець магчымасьць аўладаць тэхнікай тэй вытворчасьці, якую ён абслугоўвае.

Нарада паказала на неабходнасьць шырока скарыстаць вопыт рэчыцкай «Праўды» і «Орні», якія арганізавалі выязныя рэдакцыі ў адстаючыя калгасы і сельсаветы.

Удзельнікі нарады падкрэсьлівалі асаблівую важнасьць задачы прыцягненьня да работы газэт агранома, ільнаводаў і іншых спэцыялістаў.

З мэтай дапамогі раённым газэтам у ажыцьцяўленьні пастаўленых перад імі задач, нарада выпрацавала прыкладны план работы раённай газэты ў барацьбе за тэхнічныя культуры.

Гародніну—рабочым цэнтрам

ЖАКТЫ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ

да прыёмкі загатоўленай гародніны

БЕЛЖЫЛСАЮЗ І ГАРЖЫЛСАЮЗЫ НЕ ДАЛІ СВАІМ СЫСТЭМАМ КАНКРЭТНЫХ УКАЗАНЬНЯЎ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ХАВАЛЕНЬ

Жыльлёвая каапэрацыя абавязана неадкладна ўключыцца ў барацьбу за поўнае выкананьне пляну загатовак

5-ты АБ'ЯДНАНЫ РЭЙД БРЫГАД ЦКК-НК РСІ, „ЗЬВЯЗДЫ" „РАБОЧЕГО" І ПРАКУРАТУРЫ

ЖАКТЫ ЧАКАЮЦЬ ДЫРЭКТЫЎ, А ГАРЖЫЛСАЮЗ НЕ СЬПЯШАЕЦЦА...

Пытаньне аб арганізацыі прыёмкі гародніны жактамі для сваіх жыхароў—далёка ня новае. Цэнтральны друк высунуў гэту прапанову яшчэ ў пачатку году. Яна была горача падтрымана ўсёй рабочай і савецкай грамадзкасьцю. Здавалася-б, што кіраўніцтва жыльлёва-каапэрацыйнай сыстэмы БССР павінна было па-баявому ўзяцца за рэалізацыю прапановы, неадкладна прыступіць да падрыхтоўкі хавалень у кожным жаку. Што-ж мы маем на справе?

БРЫГАДА ЦКК-НК РСІ, «ЗЬВЯЗДЫ», «РАБОЧЕГО» І ПРАКУРАТУРЫ БССР гэтымі днямі прыступілася на вугольным сходзе старшынь менскіх жактаў, скліканым гаржылсаюзам па пытаньні аб падрыхтоўцы да прыёмкі гародніны.

Перад гэтым брыгада наведала гаржылсаюз з мэтай высьветліць становішча гэтай справы ў кіруючым органе ажыльлёвай каапэрацыі г. Менску. Аджыльлёвай каапэрацыі г. Менску. Адначак, тут брыгада не дабілася ніякага канкрэтнага адказу. Адказныя работнікі жылсаюзу адсутнічалі, прышлося зьвярнуцца да эканаміста і агранома. Эканаміст гаржылсаюзу тав. ДВОРКІНА заявіла, што яна сама разаслала па ўсіх жактах паказаньне аб падрыхтоўцы хавалень для гародніны. Аднак, калі брыгада патрабавала дакументальных доказаў, тав. Дворкіна іх не магла чамусьці прадставіць. Відавочна, гэтых доказаў няма.

Аграном тав. ФІЛАТАВА адкрыта заявіла брыгадзе, што наогул уся работа гаржылсаюзу праходзіць самацёкам без належнага кіраўніцтва. Што-ж датычыць падрыхтоўкі да прыёму гародніны жактамі, дык ў гэтай справе зроблена вельмі мала.

У 7 гадзін вечара брыгада накіравалася ў Сад камунальнікаў насход старшынь жактаў. Сход пачаўся з вялікім спазьненьнем.

Праз дзьве гадзіны пасьля вызначанага часу сабралося каля 60 проц. старшынь, і сход быў адкрыт.

З дакладу і са спрачак можна было зрабіць толькі адзін вывад: **ГАРЖЫЛСАЮЗ І ЖАКТЫ НЯ ВЫКАНАЛІ ДЫРЭКТЫВУ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПРЫЁМКІ ГАРОДНІНЫ.**

Ні адзін жакт на сёньняшні дзень ня мае хавалень. Праўленьні жактаў і гаржылсаюз нават ня ведаюць, колькі ёсьць у іх распараджэньні вольных памяшканьняў, якія-б можна было прыстасаваць пад хавальні для гародніны.

У ЖАКЦЕ № 5 па Школьнай вуліцы дом № 6/7 ёсьць два вялікія склепы, заваленыя сьмецьцем. У ЖАКЦЕ №2 па Ленінскай вуліцы ёсьць вялікі склеп, у якім можна зьмясьціць ня ніжэй 15 вагонаў бульбы. Гэты склеп таксама завален сьмецьцем.

Такія склепы ёсьць амаль у кожным жаку, але яны не адрамантаваны і ня прыведзены ў належны выгляд. Прыём гародніны жактамі для сваіх жыхароў вельмі лёгка арганізаваць, патрабуе толькі жаданьне і ініцыятыва. На жаль, імкнна гэтага ў значнай частцы праўленьняў жактаў няма.

Амаль нідзе яшчэ ня склікаліся сходы жыхароў жактаў і жанчын—работніц і жонак рабочых—па пытаньні аб загатоўцы гародніны. Праўленьні жактаў чакаюць дырэктыў ад гаржылсаюзу, апошні-ж з гэтым зусім не сьпяшаецца. У выніку справа адкладваецца з дня на дзень, ня гледзячы на тое, што загатоўкі гародніны ўжо разгарнуліся.

Сход старшынь жактаў пастанавіў: абсьледаваць усе дамы жактаў з мэтай выяўленьня вольнай плошчы для хавальня гародніны; абязязаць дамовыя камітэты ў 3-хдзённы тэрмін правесьці перапіс усіх жыхароў—пайшчыкаў каапэрацыі; абязязаць гаржылсаюз забясьпечыць жакты неабходнымі матар'яламі для рамонту сховаў і склепаў; мабілізаваць усіх інструктароў гаржылсаюзу на пэрыяд загатоўкі жактамі гародніны для непасрэднага кіраўніцтва гэтай справай.

Гэтыя пастановы сходу будуць мець рэальнае значэньне толькі тады, калі яны неадкладна будуць праведзены ў жыцьцё. Часу засталося мала.

Брыгада ЦКК-НК РСІ, «Зьвязды», «Рабочего» і пракуратуры БССР—МІШКІНД, КОРЗУН С., СЯНЬКЕВІЧ, КАЦМАН, РАМАНОЎСКІ, ЛЯГУШЭВІЧ, АНДРО.

„Пачакаем яшчэ з гэтай справай"

Белжылсаюз, праўда з вялікім спазьненьнем, даў дырэктыву гаржылсаюзам аб падрыхтоўцы да прыёму і хаваньня гародніны.

З таго часу прайшло ўжо звыш месяца, аднак, ніякага эруху пакуль што яшчэ няма. Інструктары Белжылсаюзу на мясцох літаральна бязьдзейнічаюць. Мабілізацыя тары па жактах праходзіць бяспляцнава і марудна. Ніякага ўліку гэтай работы жакты не вядуць.

Брыгада «Зьвязды» і «Рабочего» мела гутарку з намесьнікам старшыні Белжылсаюзу. Высьветлілася, што ён ня мае ніякага ўяўленьня аб сталовіцы падрыхтоўкі да прыёму гародніны на мясцох. Па яго словах, гаржылсаюзы проста ігнаруюць кіруючы цэнтр і не даюць ніякіх вестак аб сваёй рабоце. Застаецца дзівіцца, як-жа Белжылсаюз мірыцца з такім становішчам?

Белжылсаюз зусім не рэагуе на бязьдзейнасьць сваёй нізавой сыстэмы. Толькі 26 ліпеня, пад націскам апэрацыйнага штабу пралетарскай дапамогі загатоўкам гародніны, ён накіраваў на месцы новую дырэктыву з патрабаваньнем максымальна ўзмацніць падрыхтоўку да прыёму і хаваньня гародніны.

У жаку № 12 брыгада выявіла абураючыя адносіны да гэтай кампаніі з боку старшыні жакту тав. **Александровіча.**

— Ніякіх пастаноў гарсавету аб падрыхтоўцы хавалень мы не атрымалі, дый наогул гэта ня наша справа. Няхай гэтым займаецца МІРК—вазьміў ён.

Старшыня жакту № 1 тав. **Казлоў** таксама не сьпяшаецца з падрыхтоўкам да прыёму гародніны для жыхароў свайго жакту.

— **З гэтай справай мы яшчэ пачакаем**—спакойна адказаў ён брыгадзе.

Зусім зразумела, што пры такіх недапушчальна-нядбайных адносінах кіраўнікоў жактаў да падрыхтоўкі вельмі цяжка чакаць тых ці іншых посьпехаў у гэтай справе. Трэба прымусіць старшынь жактаў неадкладна ўзяцца за работу, больш уважліва выконваць дырэктывы кіруючых органаў.

Брыгада «Зьвязды» і «Рабочего» Сьцяпура, Мішкін, Горшман, Раманоўская, Мельток.

У ЖАКЦЕ № 10... „УСЁ СПАКОЙНА"

Жакт № 10 да гэтага часу наўат і не задумаўся аб падрыхтоўцы хавалень для гародніны. Старшыня жакту заўдзе, што ён ніякіх дырэктыў наводе гэтага не атрымліваў і наогул на будзе займацца прыёмам і разьмеркаваньнем гародніны сярод жыхароў. Па яго думцы «гэта не такая ўжо важная справа — калі прыбудзе гародніна, жыхары яе самі атрымаюць і будуць хаваць у слёзе на кватэры».

Наўрад ці трэба даводзіць беспадстаўнасьць гэтых разважаньняў. Мы лічым, што гаржылсаюз паўнен належным чынам узьдзейнічаць на старшыню жакту № 10 і на ўсё праўленьне, якое зусім ня цікавіцца важнай справай.

Брыгада «Зьвязды» і «Рабочего»: ГЭЙД, ВІНІК, ШОСТАК.

Дапамагчы менскаму „ТПО" ў пабудове хавалень для гародніны

Менскае транспартнае спажывецкае таварыства («ТПО») павінна пабудаваць у Сапёлках дзьве хавальні для гародніны. Адна хавальня зараз будуецца, другую-ж фактычна яшчэ не пачалі будаваць з прычыны адсутнасьці рабочай сілы. Будаўнічымі матар'ялмі пабудова хавалень поўнасьцю забясьпечана.

Для своячасовага сканчэньня будаўніцтва, патрэбна ўсяго 15 рабочых ня больш, чым на тры тыдні. Аднак, праўленьне «ТПО» ня можа дабіцца прысылкі гэтай колькасьці рабочых.

МІРК, Менбуд, гаржылсаюз павінны дапамагчы «ТПО» ў пабудове хавалень і перакінуць туды часова 15 рабочых. Рабочыя Менскага чыгуначнага вузла павінны быць забясьпечаны гародінай.

ПЭРАЛЬМАН.

Убралі 80 проц. сенажацяй

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (На тэлеграфу). Уборка сенажацяй у раёне наближаецца да канца. Большасьць калгасаў скончылі ўборку, рад калгасаў скончылі ўжо і уборку азімых і раньніх яравых. На раёне ўжо ўбрана звыш 80 проц. усіх сенажацяй і 70 проц. раньніх яравых.

РАЙШТАБ.

Ці на сваіх месцах будуецца любаньскі пеньказавод

ЛЮБАНЬ. (Наш кар.). У маі г. г. каля саўгаса Загальле пачалося будаўніцтва любаньскага пенькоўнага заводу. Да 2 ліпеня будаўніцтва было выкананна на 30%.

У сувязі з тым, што саўгас Загальле, а пенькоўнага ўхілу пераводзіцца у зьвязгадоўчы, дык будаўніцтва пенькоўнага заводу на адносіне Беліпьканопасу Загальле ў саўгас імя 10-годзьдзя БССР. Такім чынам, на будаўніцтва пеньказаводу марна патрачана 25.000 руб.

Гэтага мала. Цяпер-жа ў тым месцы, дзе пачата будаўніцтва пеньказаводу, праходзіць на адлегласьці 40 мэтраў чыгунка. Гэта пагражае частымі пажарамі заводу.

Мы пытаем Беліпьканопаўлаву: ці на сваім месцы будуецца любаньскі пеньказавод?

М. Сакалоўскі.

С. Я. Вальфсон

Вялікадзяржаўная вылазка

У № 4 «Вестника» Акадэміі Навук СССР за 1931 г. зьмешчан артыкул акадэміка Н. С. Дзяржаніна, прысьвечаны памёршаму акадэміку Е. Ф. Карскаму.

Артыкул акадэміка Дзяржаніна заслугоўвае таго, каб давесьці аб ім да ведама пралетарскай і навуковай грамадзкасьці БССР.

Напісан ён у духу славутага «апалітызму» і «аб'ектывізму» з нясумленнай тэндэнцыяй ідэалізаваць Карскага і затушаваць яго рэакцыйнасьць, вялікадзяржаўніцтва, яго клясавую варожасьць пралетарыяту. Выклікае палізарнейшае недаўменьне, калі не сказаць больш рэзка, пачатак артыкулу з указаньнем на тое, што «навукова-дасьледчыя інтарэсы акад. Карскага складаліся на ўмовах гістарычнай абстаноўкі канца 70-х і пачатку 80-х гадоў, у эпоху налышэйшага ўздыму рэвалюцыйнай хвалі і масавага захапленьня перадавых колаў расійскай лібэральнай грамадзкасьці народніцтвам — з аднаго боку, і ва ўмовах пасьледаваўшай за разгромам «Народнай Волі» няжаўй ураданай рэакцыі і белага тэрору, які бязьлітасна распраўляўся са сваім клясавым ворагам і думкай найменшае праяўленьне грамадзкай апазыцыі — з другога.» У чым сэнс гэтага ўступленьня да артыкулу і ідучага за ім указаньня, што «ў гэтай іменна абстаноўцы складаліся і навукова-дасьледчыя інтарэсы Е. Ф. Карскага і яго грамадзкія імкліваснці!».

Калі-ж гаварыць аб абстаноўцы, якая вызначыла «грамадзкія імкліваснці» Карскага, дык трэба ясна і выразна сказаць, што імкліваснці гэтыя ня толькі не салідарызаваліся з «рэакцыйнай хваляй», але былі далёка нават і ад «лібэральнай грамадзкасьці». Трэба было-б зазначыць і ацаніць факт, абойдзены ў артыкуле, — тое, што Карскі доўгі час адыгрываў у якасьці рэктара Варшаўскага імператарскага унівэрсытэту ролю аднаго з заядлых абрусіцэляў «Привислинского края», а таксама і яго далёка не «рэвалюцыйную» і нават не «лібэральную» ролю ў часе акупацыі Менску немцамі, калі ён быў назначан акупантамі апякуном вучэбнай акругі»...

Зусім недапушчальна, што аўтар артыкулу, правільна адзначаючы значныя заслугі акад. Карскага па вывучэньні беларускай мовы, бачыць адзіны недахоп яго работ, прысьвечаных беларускай мове, у тым, што яны зьяўляюцца фармалістычнымі. Гэтым указаньнем затушоўваецца факт вялікадзяржаўніцкага надыходу Карскага да беларускай мовы. Бо ў 1917 г., блук

Тысячы калгасьнікаў-адыходнікаў сталінскага закліку— у рады рабочых сацыялістычнай прамысловасьці

Правільнай расстаноўкай сіл унутры калгасаў, увядзеньнем зьдзельшчыны, шырокай папулярызацыяй законаў аб ільготах адыходнікам забясьпечым плянавы, арганізаваны набор рабочай сілы ў прамысловасьць

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР АБАВЯЗВАЕ ПРАЎЛЕНЬНІ РАЙКАЛГАССАЮЗАЎ І КАЛГАСАЎ НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ ДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ

На водных шляхах

УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ ТЭМПЫ

падрыхтоўкі да асеньняй навігацыі

Трыкутнікі, суднаў, прыстаняй, рабочыя-воднікі— разгорнутым фронтам штурмуйце прарывы, змагайцеся за поўную рэалізацыю задач, паказаных у прамове тав. Сталіна

Месячнік штурму абвешчаны прызывам ЦК союзу воднікаў па ліквідацыі ганебнага прарыву, які стварыўся на рачным транспарце ва ўмовах БССР, на даў канкрэтных вынікаў.

Па-ранейшаму рачны транспарт БССР ня выходзіць з прарываў па перавозцы грузаў, хуткасьці ходу, па ліквідацыі прастояў, здарэньняў і г. д.

Урадавыя заданьні аб павышэньні ходавага часу да 85 проц. ў месячніку штурму ня выканана. Буксырныя пераходы скарыстоўваюць толькі 45 проц. часу на карысную работу, а астатнія 55 проц. каштоўнага часу губляюць на порожні ход і прастої. Мінулай запазычанасьці па перавозцы пасажыраў, грузаў пляшкай і малай хуткасьцяў, рачны транспарт не ліквідаваў. Так, напрыклад: ЗА МАЙ І ЧЭРВЕНЬ рачны транспарт НЕ ПЕРАВЕЗ 440.000 ПАСАЖЫРАЎ, 32.000 ТОН ГРУЗУ ВЯЛІКАЙ ХУТКАСЬЦІ І 320.000 ТОН ГРУЗАЎ МАЛАЙ ХУТКАСЬЦІ, якія прадугледжаліся трансфінпляном.

ВІЦЕБСК, БЕШАНКОВІЧЫ і інш. у выкананьні трансфінпляну ганебна плятуцца ў хвосьце.

Месячнік штурму на водных шляхох не забясьпечыў баявой падрыхтоўкі да асеньніх перавозак, не забясьпечыў сапраўдна масавае разьвіцьцё сацспаборніцтва і ўдарніцтва на ўсіх вучастках рачнога транспарту. Такое становішча магло здарыцца толькі таму, што партыйныя, прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі рачнога транспарту на стані на чале месячніка штурму, не змаглі выкарыстаць энтузіязм і актыўнасьць рабочых воднікаў.

Для кожнага ў пасобку судна, баржы, прыстані, брыгады, ячэйкі і рабочага канкрэтны плян самаабавязацельстваў, хто, што павінен пэрсанальна зрабіць ў месячніку штурму для ліквідацыі прарыву — такі плян ня быў распрацаваны.

Па ВІЦЕБСКАМУ вузьле схад партыйнага і прафэсыянальнага актыву прыняў АГУЛЬНУЮ рэзалюцыю з пяці пунктаў, якая нікога і ні чому канкрэтна НЕ АБАВЯЗВАЕ.

Адной з галоўных прычын таго, што месячнік штурму ня даў патрэбных вынікаў, зьяўляецца і тое, што адозва ЦК союзу воднікаў сярод рабочых мас на суднах, баржах, прыстанях, у брыгадах ня была шырока прапрацавана і па ёй ня было канкратна намечаных мерапрыемстваў.

Гаспадарчы разрахунак яшчэ і па сённешні дзень у буйнейшых пунктах рачнога транспарту не адчуваецца. Такія буйныя пункты, як ГОМЕЛЬ, ВІЦЕБСК, БАБРУЙСК аб гаспадарчым разрахунку толькі займаюцца разважаньнямі.

На рачным транспарце ўвесь час маюць месца шматлікія аварыі, прастої, паўторныя рамонты і г. д. Усё гэта часткова тлумачыцца тым, што рабочыя водніі яшчэ не ўладалі тэхнікай сваіх працэсаў. Гэтым пытаньнем ніхто да гэтага часу не займаўся і не займаецца. Інжынэрна-тэхнічная секцыя воднікаў у гэтым напрамку бязьдзейнічае.

Патрэбна адзначыць, што рэдакцыі газэт «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ», «КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ», «КАМУНАР БАРЫСАЎШЧЫНЫ» і інш., якія абавязаны былі ўключыцца ў месячнік штурму, узмацніць штодзённае апэратыўнае кіраўніцтва, арганізаваць абмен вопытам работы лепшых ударнікаў гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый, шырока папулярызаваць сутнасьць і значэньне адозвы — імы гэты месячнік прамарглі і нічога канкрэтнага не зрабілі.

Сустрэць асеньнія перавозкі ў баявой гатоўнасьці, недапусьціць ні хвіліну лішняга прастою суднаў пад выгрузкай і нагрузкай, разгарнуць культмасавую і выхаваўчую работу сярод воднікаў — галавы і неадкладныя задачы партыйна-гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый рачнога транспарту.

Толькі магутным разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рашучай барацьбой з казённым благадушшам, коснасьцю, непаваротлівасьцю, правым і «левым» апартунізмам на практыцы, можна забясьпечыць посьпех бальшавіцкай асеньняй навігацыі, посьпех выкананьня гістарычнай адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб грунтоўнай перабудове рачнога транспарту.

Майстры вынаходцы зав. «Полымя рэвалюцыі»: Бабіцкі, Пазьняк і Кімкимес. Вынаходніцтва дала 7000 руб. эканоміі.

Буйнейшыя калгасы Кантэмірэўскага раёну (цэнтральная чорназемная вобласьць) у адказ на прамову тав. Сталіна абязьцілі сталінскі заклік адыходнікаў у сацыялістычную прамысловасьць.

«Зьвязда» на выклік газэт «Труд» і «Социалистическое земледелие» уключылася ў гэтую кампанію і зьвярнулася да ўсіх раённых газэт і рабселькораў з прапановай падтрымаць кантроўную ініцыятыву і арганізаваць усебеларускі паход за сталінскі набор калгасьнікаў у прамысловасьць.

Прэзыдыум ЦСПСБ у сваёй пастанове аб правядзеньні дня індустрыялізацыі, якая ўчора зьмешчана ў «Зьвязьдзе», асобным пунктам падкрэсьлівае неабходнасьць выкарыстаньня гэтага дня для разгортваньня Усебеларускага сталінскага закліку.

Сёньня мы зьмяшчаем аварот Белкалгасцэнтру, які патрабуе ад праўленьняў калгасаў неадкладна прыступіць да заключэньня дагавароў з прадпрыемствамі на адходніцтва, сваячасова выконваючы ўзятыя на сябе самаабавязацельствы. Мы прымушаны канстатаваць, што Наркамзрацы БССР, да гэтага часу не адгукнуўся на пачатую кампанію за Сталінскі набор калгасьнікаў, што ён нават ня мае пэўных вестак, якія калгасы прымацаваны да тых, ці іншых прадпрыемстваў на прадмет вярбоўкі рабочай сілы.

Пытаньне аб арганізаванай вярбоўцы рабочай сілы для прамысловасьці, пытаньне арганізаванага адыходніцтва—важнейшая задача дня.

«Раней звычайна рабочыя самі ішлі на заводы, на фабрыкі, быў значыць, нейкі самацёк у гэтай справе» (Сталін).

Зараз чакаць самацёку, значыць не разумець новых умоў, значыць, знаходзіцца пад патрозай недахвату рабочай сілы. Посьпехі індустрыялізацыі, разгортваньне будаўніцтва, ліквідацыя беспрацоўя ва ўсю шырыню ставяць пытаньне аб арганізаваным, а не самацёчным наборы рабочай сілы для прамысловасьці. Досьць прыгадаць такія лічбы, што па металяпрацоўчай прамысловасьці БССР недахват рабочай сілы складае каля 14 проц., па хэмічнай —каля 15 проц., а па здабычы торфу—яшчэ больш, каб уявіць усю актуальнасьць пытаньня арганізаванай вярбоўкі рабочай сілы.

У калгасах, у адноасобным сэктары сельскай гаспадаркі ў асноўным зьсьц вольныя рабочыя рукі. Колькасьць іх у калгасах яшчэ больш павялічваецца ў сувязі з увядзеньнем зьдзельшчыны, ліквідацыяй абзьялічкі і ўраўнілаўкі, што значна павышае прадукцыйнасьць працы.

Зусім відавочна, што посьпех разгортваньня адыходніцтва знаходзіцца ў цесным сувязі з прапрацоўкай на шырокіх сходах прамовы тав. Сталіна, з папулярызацыяй закону ЦВК і СНК СССР аб адыходніцтве і аб ільготах для адыходнікаў.

Закон ЦВК і СНК СССР дае шмат ільгот для калгасьнікаў-адыходнікаў. Іх заработак поўнасьцю вызваляецца ад усякіх адлічэньняў у грамадзкія фонды калгасаў. Пасьля прыезду назад ім даецца работа ў калгасе ў першую чаргу. Пры разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасе абавязкова вылучэнна частка ўраджаю для забясьпячэньня калгасьнікаў-адыходнікаў па ўстаноўленых цэнах і ў тэй-жа колькасьці, як і для іншых калгасьнікаў. Члены сям'і адыходнікаў маюць перавагу пры паступленьні на вучобу, карыстаюцца ўсімі ільготамі па ахове адароўя і атрыманьні дэфіцытных тавараў і маюць рад іншых ільгот. Калгасьнікі-адыходнікі вызваляюцца ад с.-г. падатку з неаграмаджанай часткі гаспадаркі, уключаючы неазямляробчыя заработкі.

Усе гэтыя і рад іншых ільгот бязумоўна даюцца пры ўмове сумленных адносін да працы з боку адыходнікаў. Калгасьнікі-адыходнікі, якія кідаюць работу да тэрміну на які яны закантрактаваліся, пазбаўляюцца ільгот.

Закон прадугледжвае меры заахвочваньня і калгасам, якія заключаюць дагаворы з гаспадарчымі органамі аб вылучэньні рабочых-адыходнікаў, або аб садзейнасьці вярбоўцы сваіх членаў на работу ў адыход. У дагаворах прадугледжваецца вылучэньне спэцыяльных сродкаў калгасам для паляпшэньня іх вытворчасьці ў адпаведнасьці з кольскасьцю калгасьнікаў, якія заключылі дагаворы з гаспадарчымі органамі на адыход. Прадугледжваецца пераважнае забясьпячэньне сельска-гаспадарчымі машынамі тых калгасаў, якія вылучаюць значную колькасьць адыходнікаў. Для тых-жа калгасаў устанаўліваецца перавага па арганізацыі школ і іншых культурных устаноў, а таксама пры вылучэньні сродкаў і абсталяваньня для арганізацыі сацыяльна-бытавых устаноў.

Для адыходнікаў адноасобнікаў прадугледжваецца ільгота ў зьніжэньні на палову абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам незямляробчых заработкаў і г. д.

Калгасы пры складаньні сваіх вытворчых плянаў павінны асобна ўлічваць калгасьнікаў, якія маюць спэцыяльнасьць і даваць ім магчымасьць у першую чаргу працаваць у прамысловасьці, на транспарце і г. д., пакідаючы ў калгасе толькі самую неабходную колькасьць з іх.

Закон прадугледжвае прыцягненьне да адказнасьці тых праўленьняў калгасаў, якія затрымліваюць калгасьнікаў, што хочуць пайсьці на заработкі.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб, давёўшы да кожнага калгасьніка і бедняка і серадняка—адноасобніка закон, зараз-жа прыступіць да выяўленьня і ўліку вольных рэзэрваў, да заключэньня дагавароў на рабочую сілу і адначасова ў калгасах узмацніць рацыяналізацыю працы, узьняцьце прадукцыйнасьці, а ў прадпрыемствах падрыхтаваць адпаведную сустрэчу і ўмовы новых рабочых.

Гатымі дні Наркамзрацы, ВСНГ і Калтаксцэнтр СССР па ўгадненьні з Наркамземам СССР і УсеЦСПС далі канкрэтную дырэктыву аб арганізаваных формах вярбоўкі адыходнікаў з калгасаў.

Паводле гэтай дырэктывы раённыя органы працы разам з гаспадарчымі органамі, пры ўдзеле райкалгассаюзаў, выходзячы з устаноўленых заданьняў, паказваюць кожнаму гаспадарчаму органу вызначаныя яму для вярбоўкі сельсаветы і калгасы. Пры разьмеркаваньні раёнаў і пунктаў вярбоўкі трэба выходзіць з таго аджуль звычайна, больш за ўсё прыходзіла адыходнікаў на даныя прадпрыемствы, прычым імкнуцца, каб у адным населеным пункце вербавала толькі адна якая-небудзь гаспадарчая арганізацыя.

Гаспадарчыя органы не позьней дзевяцідзённага тэрміну пасьля атрыманьня ад органаў працы ўказаньняў аб месцы вярбоўкі павінны заключыць дагаворы на вылучэньне калгасамі адыходнікаў і аб садзейнасьці вярбоўцы. У дагаворы павінны быць прадугледжаны канкрэтныя самаабавязацельствы аб лепшай арганізацыі працы ўнутры калгасу і максымальным вызваленьні лішняй рабочай сілы для работы ў адыходзе, аб вылучэньні патрэбнай гаспадарчаму органу колькасьці адыходнікаў і г. д. Гаспадарчыя арганізацыі бяруць на сябе абавязацельствы па дапамозе ў арганізацыі працы шляхам пасылкі ў калгас на пэўны час сваіх прадпрыемстваў, або шляхам утрыманьня ў калгасе за кошт гаспадарчага органу спэцыяльнага работніка па арганізацыі працы, пры ўмове, калі калгас вылучае вялікую колькасьць адыходнікаў. Гаспадарчыя арганізацыі абавязваецца дапамагчы ў складаньні вытворчага і рабочага пляну і упарадкаваньні фінансава-рахункавай работы калгасу і г. д. Саўгасы і лесгасы могуць прымаць на сябе абавязацельствы па аказаньні дапамогі бліжэйшаму калгасу сродкамі вытворчасьці, цягавай сілай і інш. Будаўнічыя арганізацыі могуць аказваць калгасам дапамогу ў праектаваньні калгаснага будаўніцтва, тэхнічным наглядзе за ім і г. д.

Паводле дырэктывы земельным і калгасным органам прапануецца вылучыць у кожным раёне спэцыяльны фонд сельска-гаспадарчых машын для разьмеркаваньня яго паміж калгасамі, якія даюць вялікае адыходніцтва. Асаблівая вялікія перавагі даюцца калгасам, якія выконваюць і перавыконваюць дагаворы з гаспадарчымі органамі.

Дырэктыва вызначае канкрэтныя мерапрыемствы ажыцьцяўленьня арганізаванага набору рабочай сілы для прамысловасьці.

Як закон аб адыходніцтве, так і памянёная дырэктыва павінны быць даведзены да шырокіх мас калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас адноасобнікаў. Органы працы, калгасы і калгасныя арганізацыі, гаспадарчыя арганізацыі павінны неадкладна прыступіць да арганізацыі адыходніцтва ў прамысловасьць. Сталінскі заклік павінен стаць пачаткам плянавай арганізацыі вярбоўкі рабочай сілы для сацыялістычнай прамысловасьці, павінен пакласьці пачатак поўнай перабудове гэтай работы згодна прапановы, якая дана ў прамове тав. Сталіна.

У арганізацыі сталінскага закліку павінны прыняць непасрэдны ўдзел усе партыйныя, прафэсыянальныя, камсамольскія і гаспадарчыя арганізацыі. Масавым заключэньнем дагавароў на рабочую сілу калгасаў і адноасобнікаў з гаспадарчымі органамі трэба сустрэць дзень індустрыялізацыі.

АДОЗВА БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ ДА УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ, ПРАЎЛЕНЬНЯЎ КАЛГАСАЎ І РАЙКАЛГАССАЮЗАЎ

У адказ на прамову тав. СТАЛІНА «Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва» перадавыя калгасы і калгасьнікі высунулі планову аб арганізацыі ўсесаюзнага сталінскага прызыву калгасьнікаў-адыходнікаў у сацыялістычную прамысловасьць.

Перад сацыялістычнай прамысловасьцю зараз паўсталі новыя адказьнейшыя задачы АРГАНІЗАВАНАГА набору рабочай сілы. «ДЛЯ ГЭТАГА ІСНУЕ ТОЛЬКІ АДЗІН ШЛЯХ—ШЛЯХ ДАГАВАРОЎ ГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ З КАЛГАСАМІ І КАЛГАСЬНІКАМІ» (З ПРАМОВЫ ТАВ. СТАЛІНА).

Вярбоўка ў сацыялістычную прамысловасьць у далейшым будзе ісьці ў асноўным за пік рабочай сілы калгасу, якая будзе ўсё больш вы[illegible]яцца ў выніку правільнай арганізацыі працы, поўнага ўвядзеньня зьдзельшчыны, мэханізацыі працы і г. д.

Таварышы калгасьнікі і праўленьні калгасаў! На кожным з вас ляжыць абавязак правільна арганізаваць працу ў калгасах, поўнасьцю ўвесьці зьдзельшчыну, поўнасьцю скарыстаць усю працоўную сілу мужчын, жанчын і падрастаў з тым, каб ЯК МОЖНА БОЛЬШ НАКІРАВАЦЬ КАЛГАСЬНІКАЎ І КАЛГАСЬНІЦ У САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.

Усе калгасы абавязаны неадкладна прапрацаваць на сходах калгасьнікаў ільготы, даныя адыходнікам пастановай ЦВК і СНК СССР ад 30 чэрвеня г. г. Трэба асаблівую ўвагу зьвярнуць на вызначэньне па калгасах спэцыяльнага харчовага фонду для забясьпячэньня сем'яў адыходнікаў з тым, каб гэта забясьпячэньне праходзіла ў поўнай адпаведнасьці з указаньнямі ўраду.

Усе праўленьні калгасаў павінны зараз-жа неадкладна прыступіць да заключэньня дагавароў з прадпрыемствамі—фабрыкамі, заводамі і саўгасамі—поўнасьцю і ў тэрмін выконваючы ўзятыя на сябе абавязкі.

Адначасова з правядзеньнем сталінскага прызыву КАЛГАСЬНІКАЎ у сацыялістычную прамысловасьць калгасы павінны садзейнічаць арганізацыі адыходніцтва сярод АДНААСОБНІКАЎ.

Калгассаюзы павінны неадкладна распрацаваць пляны прымацаваньня калгасаў да фабрык, заводаў і саўгасаў, разгарнуць масавую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў аб задачах сталінскага прызыву калгасьнікаў у прамысловасьці, і забясьпечыць поўнае выкананьне дагавароў.

Таварышы калгасьнікі, поўнасьцю ажыцьцёвім заклін перадавых калгасаў аб сталінскім наборы калгасьнікаў-адыходнікаў у сацыялістычную прамысловасьць.

НАМ. СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕНЬНЯ БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ СТРЭЛЕ.

Апал—прамысловым цэнтрам

Непадача вагонаў чыгункай

зрывае забесьпячэньне Менску дровамі

Прафсаюзы адказваюць за выкананьне пляну загатовак

Абсалютна безадказныя і ў радзе выпадкаў зусім злачынныя адносіны да загатовак дроў з боку раду лесгасаў (Асіпавічы, Глуск, Пасталы, Бярэзіна і інш.) — зрываюць плянавае забесьпячэньне рабочых цэнтраў апалам.

За 18 дзён ліпеня з Менску выехала па дрэвазагатоўкі 1.500 чалавек. Выехаўшыя дружыньнікі на месцох па-баявому штурмуюць прарывы, дапушчаныя ў загатоўках дроў (камбуз, мэдінстытут, абутковая фабрыка і інш.).

У апошнія дні ў загатоўках і вывазцы дроў пачынаецца некаторы зрух. Так, АСІПАВІЦКІ ЛЕСПРАМГАС НА ПУНКТЫ АДПРАЎЛЕНЬНЕ ДАЕ КОЖНЫ ДЗЕНЬ ПА 500 ВАЗОЎ ДРОЎ.

АЛЕ НЕДАПУШЧАЛЬНА АДНОСІЦЦА ДА ВЫВАЗКІ ДРОЎ З ПУНКТАЎ АДПРАЎЛЕНЬНЯ ЧЫГУНКА, ЯКАЯ НЕ ДАЕ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ ВАГОНАЎ ДЛЯ АДГРУЗКІ І НАКІРАВАНЬНЯ ДРОЎ У ПУНКТЫ АДПРАЎЛЕНЬНЯ. У ВЫНІКУ ГЭТАГА Ў АСІПАВІЦКІМ, БАБРУЙСКІМ І ГЛУСКІМ ЛЕСПРАМГАСАХ ЛЯЖЫЦЬ ЗВЫШ 300 ВАГОНАЎ ДРОЎ, ЯКІЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ НАКІРАВАНЫ Ў МЕНСК.

ПЯТРЫКОЎСКІ ЛЕСПРАМГАС, ЯКІ ТАКСАМА ЗАМАЦОВАНЫ ЗА МЕНСКАМ, ДАЕ СА СПЛАВУ НА ЧЫГУНКУ КОЖНЫ ДЗЕНЬ КАЛЯ 1.500 ВАЗОЎ ДРОЎ. ДАСТАЎКА Ў МЕНСК ГЭТЫХ ДРОЎ ТАКСАМА ЗАТРЫМЛІВАЕЦЦА ФАКТЫЧНА 3-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ВАГОНАЎ.

КІРАЎНІЦТВА ЧЫГУНКІ ПАВІННА БЕЗАДКЛАДНА ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ І ДАЦЬ ВАГОНЫ ДЛЯ АДГРУЗКІ І АДВОЗКІ ДРОЎ РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ.

Узмацніць кіраўніцтва Броскім вучлеспрамгасам

План дровазагатовак па Броскім леспрамгасе САРВАНЫ.

Замест 96.000 кубометраў на 20-га ліпеня загатоўлена усяго... 3.000.

Гэты ганебны прарыў кіраўніці БРОСКАГА леспрамгасу тлумачаць адсутнасьцю рабсілы.

На справе гэта ня так. РАБОЧАЯ СІЛА ЁСЬЦЬ. Яе можна мабілізаваць. Уся бяда ў тым, што ВУЧЛЕСПРАМГАС НЕ НАЛАДЗІЎ ДАСТАЎКІ ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАНЬНЯ НА ЛЕСАРАСПРАЦОЎЧЫЯ ВУЧАСТКІ, НЕ АРГАНІЗАВАЎ ПРАВІЛЬНАЙ СЫСТЭМЫ АПЛАТЫ, НЕ КЛАПАЦІЎСЯ АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ РАБОЧЫХ ДЭФІЦЫТНЫМІ ТАВАРАМІ.

Гэта спрыяла масаваму лятунству рабочых з лесараспрацовак.

ПАСТАЯННЫЯ БРЫГАДЫ НА ЛЕСАРАСПРАЦОЎЧЫХ ВУЧАСТКАХ НЕ АРГАНІЗАВАНЫ. МЭТАДЫ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА Ў РАБОЦЕ НЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА.

Месячнік лесазагатовак прайшоў міма ўвагі партыйнай, прафсаюзнай і іншых арганізацый.

МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ, БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКАЯ ЧАСТКА ВЁСКІ АБ МЕСЯЧНІКУ НІЧОГА НЯ ВЕДАЛІ І НЯ БЫЛІ МАБІЛІЗАВАНЫ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ.

Кіраўнікі Броскага вучлеспрамгасу ня справіліся са сваімі задачамі, па-апартуністычнаму недаацанілі ўсёй гаспадарча-палітычнай важнасьці кампаніі лесазагатовак.

ЛЕСБЕЛ ПАВІНЕН УЗМАЦНІЦЬ КІРАЎНІЦТВА БРОСКІМ ВУЧЛЕСГАСАМ.

Рабочая брыгада зводу «Беларусь БАРУШКА і ГАЛІМСКІ.

Чорная дошка леспрамгасаў, якія ганебна зрываюць пляны загатовак дроў

(Выкананьне квартальнага заданьня ў процантах)

Менскі	—	0,4 проц
Чэрвеньскі	—	0,6 „
Борканіцкі	—	0,9 „
Неманскі	—	1,8 „
Полацкі	—	3,2 „
Уборацкі	—	3,7 „
Хойніцкі	—	5,1 „
Прапойскі	—	6,2 „
Барысаўскі	—	6,4 „
Рэчыцкі	—	8,0 „
Глускі	—	8,0 „
Пасталоўскі	—	9,9 „
Бярэзінскі	—	8,3 „
Лепельскі	—	11,1 „
Бабруйскі	—	12,6 „
Тураўскі	—	12,8 „
Слуцкі	—	13,8 „
Асіпавіцкі	—	21,7 „

Падрыхтоўка пажарных кадраў

Пытаньне аб кадрах—самае балючае пытаньне ў пажарнай справе. Ваяцізаваная пажарная ахова ня мае падрыхтаванай кваліфікаванай зьмены. Зараз пры добраахвотных пажарных дружынах арганізуюцца атрады з моладзі. Пад росткі будуць вывучаць пажарную справу, каб у будучым стаць кваліфікаванымі пажарнымі работнікамі.

У атрад прымаюцца асобы мужчынскага полу ад 16 да 18 год. Запіс у атрад праводзіцца штодзённа ў канцылярыі Менскай добраахвотнай пажарнай дружыны. (Рэспубліканская, 4) ад 7 да 9 гадз. вечара.

Р. Дорскі.

Дэкада скончылася, аглад перабудовы каапэрацыі працягваецца

ШТОДЗЭКАДНА АДКРЫВАЦЬ НЯ МЕНШ 89 МАГАЗЫНАЎ

Дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК аб пашырэньні крамнай сеткі павінны быць рэалізаваны

Праўленьне Белкаапсаюзу пашырыла першапачаткова вызначаны плян адкрыцьця новых прадуктовых і прамтаварных магазынаў у БССР з 160 ДА 267. Павінна быць адкрыты 102 магазыны гароднінны, 27 фруктовых, 11 галянтарэйных, 14 гатовай вопраткі, 22 малочных. МЕНСКУ дана заданьне адкрыць 72 крамы, ВІЦЕБСКУ—44, ГОМЕЛЮ—48, БАБРУЙСКУ—27, МАГІЛЕВУ—23, БАРЫСАВУ—16, ВОРШЫ—15, РЭЧЫЦЫ—7.

У сярэднім ШТОДЗЭКАДНА ПАВІННА БЫЦЬ АДКРЫТА НЯ МЕНШ 89 НОВЫХ МАГАЗЫНАЎ з такім разьлікам, каб УСЮ РАБОТУ СКОНЧЫЦЬ НА ПРАЦЯГУ ТРОХ ДЭКАД.

Трэба канстатаваць, што аб'яднаньні БКС і ЦРК праяўляюць недаацэнку важнасьці пашырэньня гандлёвай сеткі. Да гэтага часу па ўсёй БССР АДКРЫТА ЎСЯГО 37 МАГАЗЫНАЎ, з якіх на долю аб'яднаньня прыходзіцца 6, а рэшта—на ЦРК і ЗРК. Між тым, чаргі ва многіх крамах ня толькі не зьмяншаюцца, а павялічваюцца. Становішча пагоршваецца яшчэ і тым, што ўжо пачынаецца паток гароднінны, а крамная сетка НЕ ПАДРЫХТАВАНА ДА ЯЕ ПРЫЁМКІ.

Дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК аб пашырэньні сеткі крам і аказаньні садзейнасьці каапэрацыі з боку райкомаў і гарсаветаў, якія мы сёньня друкуем, патрабуюць прыняцьця безадкладных мер, каб дабіцца пералому ў гэтай справе. Трэба самым рашучым чынам ударыць па апартуністычных элемэнтах, якія перашкаджаюць выкананьню дырэктыў партыі аб разгортваньні сеткі крам.

Старшыням гарсаветаў Менскага, Бабруйскага, Віцебскага, Полацкага, Аршанскага, Магілеўскага, Гомельскага, Рэчыцкага, Мазырскага, Барысаўскага і сакратаром райкомаў КП(б)Б

Надаючы выключнае значэньне адкрыцьцю новай сеткі крам спажывецкай каапэрацыі, асабліва па прадуктах харчаваньня, у выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б), прапануем на працягу 10 дзён вызваліць памяшканьні гандлёвага тыпу, якія раней скарыстоўваліся, як крамы, і перадаць спажывецкай каапэрацыі. Акажэце ўсямерную садзейнасьць аб'яднаньням БКС і ЦРК у адкрыцьці новых крам, арганізуйце спэцыяльныя тройкі ў складзе райкому, гарсавету і каапэрацыі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Нам. старшыні СНК БССР БЭНЭК.

Пастанова ЦК КП(б)Б.

АД 27 ЛІПЕНЯ 1931 Г.

У выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб адчыненьні новых крам прапанаваць райкомам КП(б)Б, гарсаветам гарадоў Менску, Бабруйску, Віцебску, Полацку, Воршы, Магілева, Гомелю, Рэчыцы Мазыра і Барысава—на працягу 10 дзён перадаць спажкаапэрацыі ўсе памяшканьні гандлёвага тыпу, што знаходзяцца ў іх распаряджэньні, каб у гэтым ніхто не перашкаджаў.

Для выяўленьня гэтых памяшканьняў стварыць камісіі з прадстаўнікоў гарсаветаў, райкомаў і каапэрацыі.

Прапанаваць Белкаапсаюзу камандыраваць сваіх упаўнаважаных у буйнейшыя цэнтры.

Гарсаветам прадаставіць памяшканьні спажкаапэрацыі для разгортваньня яе каапэрацыйных рынкаў разам з Дзяржгандлем, саматужнай і інвалідной каапэрацыяй. Арганізацыю рынкаў ускласьці на каапэрацыйныя арганізацыі па ўказаньні БКС і пад агульным кантролем вылучанай тройкі.

Прапанаваць КБС неадкладна па прадастаўленьні памяшканьняў, прыступіць да адкрыцьця новых магазынаў як па лініі аб'яднаньняў, так і па лініі ЦРК.

ЦК КП(б)Б.

ЛІКВІДУЕМ ЧАРГІ

НАРОДНЫ КАМІСАР ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ СССР—ТАВ. МІКАЯН (У ДЫРЭКТЫВЕ ОРГАНАМ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПРАПАНАВАЎ: РАЗАМ З ШЫРОКІМ РАЗГОРТВАНЬНЕМ МАГАЗЫНАЎ І КРАМ ПА ЛІНІІ КААПЭРАЦЫІ І ДЗЯРЖГАНДЛЮ АРГАНІЗАВАЦЬ ГАРАДЗКІЯ І РАЕННЫЯ РЫНКІ ДЗЯРЖГАНДЛЮ І КААПЭРАЦЫІ ПА ПРОДАЖЫ ГАРОДНІННЫ І ІНШЫХ ХАРЧОВЫХ ПРЫПАСАЎ І ЎСЯКАГА РОДУ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬНЯ І ХАТНЯГА ЎЖЫТКУ.

***

У мэтах паскарэньня тавараабароту і разгрузкі магазынаў ад продажу непатрэбных тавараў і ліквідацыі чаргі прэзыдыум Цэнтрасаюзу прапанаваў усёй каапэрацыйнай сыстэме:

Безадкладна выкарыстаць існуючую сетку ларкоў для разгортваньня гандлю гароднінай і галянтарэяй на рынках.

Разам з выкарыстаньнем памяшканьняў, крам, ларкоў і палатак старых рынкаў дадатково разгарнуць рыначна-палатачны гандаль шляхам арганізацыі новых рынкаў савецкага каапэрацыйнага гандлю.

Асаблівую ўвагу аддаць арганізацыі палатачнага гандлю гароднінай у рабочых раёнах і недэфіцытнымі прамтаварамі і вырабамі саматужнай прамысловасьці ў пунктах, куды зьяжджаюцца наўкольныя сяляне.

Усебеларускі зьезд прамкаапэрацыі

Справаздачнаму дакладу праўленьня Белкаапрамсаюзу і спрэчкам па ім былі прысьвечаны 2 дні. Усяго выказалася 150 дэлегатаў.

У сваіх выступленьнях дэлегаты з месц закранулі ўсе галіны работы прамысловай каапэрацыі. Пляны прамкаапэрацыі бязумоўна рэальныя. Але ў радзе раёнаў райсаюзы і арцелі не пераключыліся на бальшавіцкія тэмпы работы. Некаторыя мясцовыя арганізацыі недаацэньваюць ролі і значэньня прамкаапэрацыі.

Ёсьць рад фактаў пераманьваньня работнікаў прамкаапэрацыі. Пухавіцкі райвыканком на працягу цэлага году не даваў прамкаапэрацыі магчымасьці разгарнуць выраб цэглы. Адзін з работнікаў Касьцюковіцкай КК-РСІ на скаргі райпрамсаюзу аб ігнараваньні прамкаапэрацыі руху адказаў: «Паняцьця ня маю, што такое прамкаапэрацыя».

Раённыя спажывецкія таварыствы ня выконваюць дырэктыў ураду аб забесьпячэньні прамкаапэрацыйнай сыстэмы прадуктамі і прамтаварамі.

Многія з выступаўшых асабліва спыняліся на прарывах у выкананьні пляну па будматар'ялах, торфе і па выробе мыла і заняткалі дэлегатаў мабілізаваца на ліквідацыю гэтых прарываў.

Старшыня Белкаапрамсаюзу т. Брыскін у заключным слове адзначыў, што прамкаапэрацыя павінна даць пралетарскай дзяржаве ў 1931 годзе прадукцыі на 150 млн. руб. Плян павінен быць выкананы. Трэба ўзяць на буксір адстаючыя раёны.

К.

Камунальную гаспа[illegible] на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

ТЭЛЕФОННУЮ СТАНЦЫЯ [illegible]ЬЦЬ У ТЭРМІН!

Праект пабудовы новай пральні не адпавядае патрэбам насельніцтва

Нябывалымі тэмпамі расьце 1 разьвіваецца сталіца Савецкай Беларусі. З ростам прамысловасьці колькасна расьце і пралетарыят. Ужо цяпер рэдка знойдзеце сям'ю дзе-б працаздольныя яе члены не працавалі. Праўда, ёсьць яшчэ так званыя «хатнія гаспадыні», але па крысе і гэта катэгорыя адыходзіць у абсяг гісторыі. Трэба фарсаваць будаўніцтва культурна-бытавых устаноў (ясьлі, сталоўкі, дзіцячыя сады, пральні і г. д.).

На шэйнай фабрыцы «КАСТРЫЧНІК» з-за галавацяпства будаўнічых арганізацый не пабудаваны новыя ясьлі, і работніцы (сярод іх шмат кваліфікаваных), ня маючы на каго пакінуць дзяцей, прымушаны звальняцца з работы.

Старая пральня ў горадзе ня можа абслужыць насельніцтва. Бялізна прымаецца ў зусім абмежаванай мізэрнай колькасьці, а выдаецца не раней двухмесячнага тэрміну. Дрэнная работа пральні порашкаджае вызваленьню жанчыны ад хатняй работы.

Менскі гарсавет вынес пастанову аб будаўніцтве новай пральні і даручыў гэту работу Абкамтрэсту. Апошні заказаў праект пабудовы бабруйскаму інжынэру Бэрману, які прадставіў бабруйскую пральню. Бэрман адразу склаў праект пральні ў Менску ёмістасьцю ў чатыры разы большую, чым цяперашняя; у ёй павінна быць столькі і столькі машын і... усё ў парадку.

У Абкамтрэсьце праект зацьвердзілі. Ці жарты, у чатыры разы большая ёмістасьць! Лічба вялікая — у любога можа закружыцца галава.

Пачалі будаваць, вывелі сьцены і зараз трэба ўжо пакрываць дахам. Цяпер выяўляец

Год выданьня—XV
№ 207 (4112)
Нядзеля, 2 жніўня 1931
Цана нумара 5 кап.
Выходзіць бесьперапынна

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Рэдакцыя і кантора Менск, Савецкая, 63. Тэлефоны: рэдактар—4-27.)—сакратар—10-74, партсэктар—13-90, прапысл.—13-80, сц. зял.—6-19, масьл. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжнародны інфармацыі—10-74, кантора выд-ва—7-81, адд. абвестак—7-31

Аб выданьні „гісторыі грамадзянскай вайны“

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 30-VII-1931 г.

Ухваліць ініцыятыву тав. **А. М. Горкага** і прыступіць да выданьня для шырокіх працоўных мас «Гісторыі грамадзянскай вайны» (1917-1921 г. г.) у 10-15 тамох у выглядзе зборнікаў навукова-гістарычных артыкулаў і літаратурна-мастацкіх твораў.

Для рэдагаваньня «Гісторыі грамадзянскай вайны» стварыць:

1) **Галоўную рэдакцыю** ў складзе т. т. **Горкага, Молатава, Варашылава, Кірава, Бубнова, Гамарніка і Сталіна.**

2) **Гістарычную рэдакцыю** ў складзе т. т. **Пакроўскага, Бубнова, Горкага, Яраслаўскага, Скрыпніка, Гамарніка, Якаўлева Я. А., Ахундава, Стэцкага, Папова Н. Н. і Эйдэмана.**

3) **Мастацкую рэдакцыю** ў складзе т. т. **Горкага, Дзям'яна Беднага, Фадзеева, Усевалада Іванава, Леонава, Мікітэнка, Чарота, Кіршона, Эйдэмана, Федзіна, Панферава і М. Кальцова.**

ЦК УсеКП(б).

УДЗЕЛЬНІКАМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

Таварышы!

У Саюзе Саветаў пачата і з кожным годам усё больш магутна, пасьпяхова расьце работа па будаўніцтве сацыялізму. У жалезным шуме гэтай вялікай работы, у бесьперапынным гэрайчным напружаньні працоўнай энэргіі—час бяжыць хутка, і мы лёгка забываемся аб тым, чым жылі ўчора. Забываюцца байцамі грамадзянскія вайны і бойкі, якія прывялі рабочую клясу Саюзу Сацыялістычных Рэспублік да перамогі над нечалавечай бязадказнай уладай цара, памешчыкаў, фабрыкантаў.

Наша рабоча-сялянская моладзь павінна добра ведаць працу і гэройства сваіх бацькоў, павінна падрабязна ведаць ролю рабочае клясы і яе камуністычнай партыі ў арганізацыі вялікай перамогі перадавога атраду пралетараў усіх краін.

Ёй патрэбна расказаць аб тым, як рабочыя царскай Расіі вялі ўзброеную барацьбу за ўладу саветаў, за сваё права перабудаваць гаспадарку на сацыялістычны лад, за права стварыць з рабскай краіны свабодную пралетарскую дзяржаву. Чатыры гады біліся амаль голымі рукамі поўталодныя, паўадзетыя рабочыя і сяляне супроць армій, якія арганізавалі вучоныя царскія генэралы на сродкі памешчыкаў і фабрыкантаў, супроць палкоў, дзе амаль кожны радавы быў афіцэрам. Біліся супроць спэцыялістаў вайны, дасканала ўзброеных чужаземнымі капіталістамі, якім за гэта рускія капіталісты абяцалі прадаць рабочых і сялян у такое-ж рабства, у якім жывуць нэгры ў афрыканскіх калёніях Эўропы ці рабочыя ў Кітаі пад бесчалавечным уціскам сусьветнага капіталу. Чатыры гады цягнулася гэта бойка і скончылася поўнай перамогай рабочае клясы і працоўнага сялянства—бацькоў і старэйшых братоў нашых пінэраў і камсамольцаў.

Наша рабоча-сялянская моладзь павінна ведаць, што гэтай перамогай зроблен пачатак новай сусьветнай гісторыі, новым сацыялістычным формам жыцьця працоўнага народу. Ня толькі наша юнацтва павінна ведаць усё гэта, але гэта неабходна ведаць пралетарыяту і працоўным масам усёй зямлі,—яны, сьледуючы прадуказаньням гісторыі і вашаму прыкладу, таксама рыхтуюцца да рашучых баёў супроць свайго ворага, супроць сусьветнага капіталізму, патрапанага, расхістанага няўхільнымі непрымірымымі супярэчнасьцямі ўнутры яго, але ўсё яшчэ мэханічна выціскаючага кроў рабочае клясы—адзіную сілу, якою ён жыве.

І вось у мэтах азнаямленьня нашай моладзі ўсіх народаў, што ўключаюцца ў сям'ю Саюзу Сацыялістычных Саветаў, і ў мэтах азнаёміць усіх працоўных Саюзу з недалёкім мінулым—з гісторыяй гэрайчнай барацьбы рабочых і сялян пад кіраўніцтвам кампартыі супроць фабрыкантаў і памешчыкаў—задумана работа па выданьні «Гісторыі грамадзянскай вайны».

Работу гэту арганізуюць людзі, даволі вядомыя працоўнаму народу Саюзу Саветаў.

Для таго, каб кнігі гэтай «Гісторыі» чыталіся лёгка і былі ўсякаму зразумелымі, да апрацоўкі яе дакумантаў прыцягваюцца ўсе нашы лепшыя мастакі слова. На іх абавязак ускладаецца расказаць аб баявых гадох грамадзянскай вайны з «предельной» прастатой, яснасьцю і правільнасьцю.

Дакумантаў шмат, але ўсё такі іх мала для поўнага і правільнага асьвятленьня ўсіх падзей 17-21 г. г. Неабходна, каб у гэтай вялікай і трудная рабоце прынялі актыўны ўдзел непасрэдныя ўдзельнікі грамадзянскай вайны: чырвонагвардэйцы, партызаны, чырвонаармейцы, камандыры і ваенкомы тых год, а таксама і людзі, пацярпеўшыя ад грабежніцтваў і гвалту белых армій, атрадаў інтэрвэнтаў, ад зграй бандытаў і г. д.

Патрэбна, каб усе людзі, якія памятаюць падзеі тых год, тыя, якія стварылі падзеі, запісвалі і прысылалі ў рэдакцыю «Гісторыі» свае запіскі.

«Гісторыя» ставіць сваёй мэтай падрабязна асьвятліць разьвіцьцё і ўмовы грамадзянскай вайны па ўсіх галінах і рэспубліках Саюзу Саветаў.

Барацьба за Ленінград, у Паўночным краі, Паволжы, Данбасе, Украіне, Беларусі—барацьба з польскімі панамі, Паўночным Каўкаскім краі, Закаўказьзі, рэспубліках Сярэдняй Азіі, па Заходняй і Усходняй Сібіры, Далёкім Усходзе, па ўсёй зямлі Саюзу Саветаў. Рэдакцыя зварачаецца ня толькі да партызанаў, чырвонаармейцаў і наогул актыўных удзельнікаў ваенных дзеяньняў, але і да ўсіх абласных мясцовых работнікаў у галіне культуры, напр., сельскіх настаўнікаў. «Гісторыя» ставіць сваёй мэтай паказам слаўных боек рабочае клясы і працоўнага сялянства, паказам гэройствы паасобных заводаў і фабрык, чырвонагвардэйскіх і партызанскіх атрадаў і чырвонаармейскіх палкоў перадаць маладому пакаленьню лепшыя традыцыі пралетарскай барацьбы. Неабходна таксама прышамятаць і асьвятліць:

Умовы мабілізацыі насельніцтва белымі арміямі.

Забіраньне скаціны, аграбленьні вёсак, пакараньні працоўных, западаэроных у бальшавізьме, і наогул карныя меры белых атрадаў.

Паводзіны нямецкай армії.

Паводзіны чэха-славакаў і розных інтэрвэнтаў.

Паводзіны польскай і пятлюраўскай армій.

Роля духавенства ў грамадзянскай вайне і г. д.

Гэта атульныя паказаньні, але апрача іх у некаторых выпадках павінны быць пастаўлены прыватныя патрабаваньні, напрыклад:

На Паволжжы—асабліва ў Самары, Уфе і г. д., дзеяньні «народнай» армії Комуча, паводзіны эсэраў, меншавікоў; кожная вобласьць, кожная рэспубліка павінна выявіць свае асабліваські ў барацьбе з ворагамі.

Патрэбна пісаць аб усім, што прынесілі з сабою армії памешчыкаў і фабрыкантаў, атрады чужаземных салдат, анархічныя зграі бандытаў,—патрэбны факты, як можна больш жывых, правільна расказаных фактаў.

Удзельнікі рэвалюцыйнай барацьбы павінны расказаць аб сваім удзеле ў баёх. Было-б ня дрэнна, калі-б і былыя ўдзельнікі «зялёнага руху», банд Махно, Грыгорь'ева, Цюцюніньніка і інш. бандытаў таксама расказалі аб іх дзеяньнях. Апошнім трэба памятаць, што іх запрашаюць ня каяцца ў старых грахох, а толькі дапамагчы асьвятліць гістарычныя падзеі.

Чым больш зьбярэцца матар'ялу, тым паўней і правільней будзе «Гісторыя», якую неабходна ведаць усім працоўным.

Рэдактары «Гісторыі» цьвёрда спадзяюцца, што на іх заклік зараз-жа адкліснуцца ўсе тыя людзі, якім зразумела вялізная і трудная задача, выраўнаць якую мы абавязаны.

Для палягчэньня работы па запісах успамінаў аб падзеях грамадзянскай вайны мы раім—там, дзе гэта магчыма, зьбірацца групамі і правяраць паказаньні адзін аднаго.

І так—за справу! Справа вялікая і добрая. Калі яна будзе зроблена, нашы байцы ўбачаць сябе людзьмі, якія зрабілі нябывалыя, надзвычайныя гэройствы, а наша моладзь пачэрпне з гэтай «Гісторыі» новы зарад працоўнай і творчай энэргіі, неабходнай для завяршэньня справы вялікай, нябывалай у гісторыі чалавецтва.

М. ГОРКІ.

30 ліпеня 1931 г.

Кангрэс сацыял-інтэрвэнтаў

Блудлівая крывадушнасьць „левых“ махераў

ВЕНА, 31. На кангрэсе II Інтэрнацыяналу скончыліся спрэчкі па рэзалюцыі аб разбраеньні. У пропівагу рэзалюцыі камісіі ангельскія незалежнікі, «бундаўцы» з Польшчы і польскія «незалежныя сацыялісты» прапанавалі сваю рэзалюцыю, насычаную крывадушнымі «радыкальнымі» фразамі, якія заклікаюць партыі II-га Інтэрнацыяналу «праводзіць рэвалюцыйны націск на свае ўрады, каб перашкодзіць узьнікненьню вайны», а ў выпадку, калі вайна будзе абвешчана, спыніць яе «шляхам зьвяржэньня капіталізму».

Рэзалюцыя патрабуе таксама «барацьбы сацыял-дэмакратычных партый усіх краін за разбраеньне», прычым зусім не ўспамінаецца савецкі праект аб разбраеньні. Прадстаўнік ангельскай незалежнай рабочай партыі Браўсей, абараняючы прапанову меншасьці, адзначыў, што рэзалюцыя большасьці, якая перадае справу разбраеньня Ліве Нацый, выклікае расчараваньне рабочых мас.

Швайцарац Шмідт прачытаў заяву, у якой швайцарскія сацыял-дэмакраты адхіляюць рэзалюцыю камісіі, як стваральную ў рабочай клясе ілюзію, нібы можна правесьці разбраеньне праз Лігу Нацый. Аднак, у інтарэсах адзінства швайцарская сацыял - дэмакратыя ўстрымліваецца ад галасаваньня.

Рэнадель лічыць, што назваць Лігу Нацый імпэрыялістычнай—тактычная памылка, якая аслабляе пазыцыі сацыял-дэмакратыі. Сацыял-дэмакраты па вінны ўзмацніць сацыялістычны ўплыў у Ліве Нацый і дабіцца ўцягненьня Амэрыкі ў Лігу.

Пленум пераходзіць да галасаваньня рэзалюцыі па прыняцьці карпаратыўнасьці, г. зн. па дэлегацыях. За рэзалюцыю камісіі паданы 34 галасы, супроць 2 ангельскіх незалежнікаў, 1 польскага незалежніка. Швайцарская дэлегацыя ўстрымалася ад галасаваньня. (ТАСС).

Вялікі посьпех савецкіх с.-г. машын у Турцыі

АДЭСА, 31. У Адэсу прыбыў гандлёвы прадстаўнік СССР у Турцыі тав. **Хадароўскі.** У гутарцы з карэспандэнтам Рату ён адзначыў, што савецкі экспарт у Турцыю узмацняецца. Павялічваецца таксама роля прамысловай і тэхнічнай прадукцыі, у прыватнасьці вялікім посьпехам карыстаюцца савецкія с.-г. машыны. Гэтаму нямала спрыяла міжнародная выстаўка с.-г. машын у Анкоры, на якой савецкі павільён лічыўся лепшым.

Па ўборачных машынах СССР гэтым летам заняў у Турцыі пануючае становішча. Гэтаму нямала спрыяла высокая якасьць нашых машын і прыгоднасьць іх да ўмоў сельскай гаспадаркі Турцыі. Зацікаўленасьць да с.-г. машын такая вялікая, што ў хуткім часе некалькі турэцкіх спэцыялістаў зьбіраюцца пабываць на савецкіх заводах с.-г. машынабудаўніцтва.

Ударная дэкада рэалізацыі пазыкі на вёсцы

Емельянаўскі сельсавет прэміяваны

за ўзорнае правядзеньне падпіскі і добра пастаўленую масавую работу

Сельсаветы Віцебскага прыгараднага раёну перавысілі кантрольнае заданьне па рэалізацыі пазыкі

Раўненьне па пераможцах-ударніках фінансавага фронту!

Вучыцца на прыкладзе перадавікоў

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ФІНАНСАЎ БССР ПАСТАНАВІЎ ПРЭМІЯВАЦЬ ЗА ШЫРОКА РАЗГОРНУТУЮ ПАЛІТЫЧНА-МАСАВУЮ РАБОТУ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ, ЗА ПРЫКЛАДНУЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ СЕЛЬСКАЙ КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ ЕМЯЛЬЯНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, СМАЛЯВІЦКАГА РАЁНУ, ДЗЕ ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ ПЕРАВЫСІЛА КАНТРОЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ, ДАЛА 14.775 РУБ., ДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫЯ ПОЎНАСЬЦЮ АХАПІЛА ПРАЦОЎНАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА. СТАРШЫНІ СЕЛЬСАВЕТУ ТАВ. СКУРАТОВІЧУ ВЫДАЕЦЦА ПРЭМІЯ Ў 100 РУБ.; 250 РУБ. ВЫДАЮЦЦА Ў РАСПАРАДЖЭНЬНЕ СЕЛЬСАВЕТУ ДЛЯ ПРЭМІЯВАНЬНЯ ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ І ЎДАРНІКАЎ ПАДПІСКІ.

ЗА ПРЫКЛАДНУЮ РАБОТУ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ, ЗА ПОЎНЫ АХОП ІХ ПАДПІСКАЙ, ПРЭМІЮЕЦЦА Ў СУМЕ 300 РУБ. КАМІСІЯ САДЗЕЙНАСЬЦІ ДЗЯРЖКРЭДЫТУ І АШЧАДСПРАВЕ ПРЫ КАЛГАСЕ «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», САМАХВАЛАВІЦКАГА РАЁНУ.

ВЫДАЕЦЦА ПРЭМІЯ Ў СУМЕ 300 РУБ. КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ ПРЫ КАЛГАСЕ «СЕРП І МОЛАТ» АНУСІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЗАСЛАЎСКАГА РАЁНУ, ДЗЕ, ДЗЯКУЮЧЫ ДОБРА ПРАВЕДЗЕНАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОЦЕ АХОПЛЕНЫ ПАДПІСКАЙ УСЕ КАЛГАСЬНІКІ, ПРЫЧЫМ СУМА ПАДПІСКІ ЗНАЧНА ПЕРАВЫСІЛА ТРОХТЫДНЁВЫ ДАХОД КАЛГАСЬНІКАЎ.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ФІНАНСАЎ БССР ЗАКЛІКАЕ ЎСІХ АКТЫВІСТАЎ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ НАПРУЖЫЦЬ ЎСЕ СІЛЫ, КАБ ПОЎНАСЬЦЮ РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ Ў АДСТАЛЫХ РАЁНАХ БССР.

Рапарт ЦК КП(б)Б, рэдакцыі „Зьвязды“ і Наркамфіну

Заданьне па рэалізацыі пазыкі ў сельсаветах Віцебскага раёну перавыканана. Кантрольная лічба ў 180.000 руб. рэалізавана ў разьмеры 184.000. За наяўныя грошы прадана аблігацый на 24.000 руб. Падпіска працягваецца.

Гарком КП(б)Б РЭЗЬНІКАЎ.
Гарсавет КАМЭНШТЭЙН.
Гарпрафсавет РАЗУМАЎ.

Калгасы даюць узорныя прыклады падпіскі

ВІЦЕБСК. (БЕЛТА). КАЛГАС «КАПАЧОВА», У ПАРАДКУ САЦСПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ КАЛГАСЬНІКАМІ, ПРЫ ФОНДЗЕ ТРОХТЫДНЁВАГА ДАХОДУ Ў 1.000 РУБ. ПАДПІСАЎСЯ НА СУМУ Ў 1.405 РУБ. ПАДПІСКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА. АДЗІН КАЛГАСЬНІК ВЫКЛІКАЕ ДРУГОГА НА ПАДПІСКУ Ў РАЗЬМЕРЫ МЕСЯЧНАГА ДАХОДУ.

***

ДРЫСА. (НАШ КАР.). З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ ПРАЙШЛА ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ Ў КАМУНЕ «НОВАЯ ЗАРА». ТРОХТЫДНЁВЫ ФОНД ЗАРАБОТКУ ПА КАМУНЕ РАЎНЯЕЦЦА 950 РУБ. ФОНД ПЕРАВЫШАН НА 550 РУБ. — ПАДПІСКА ДАСЯГНУЛА 1.500 РУБ. АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ПАДПІСЦЫ ПРЫНЯЛІ ЖАНЧЫНЫ: **ГАННА ФЕДАРОНАК,** БЯДНЯЧКА, ПАДПІСАЛАСЯ НА 25 РУБ., **МАРЫЛЯ ГЛАЧОНАК** — НА 30 РУБ. КАМУНА «НОВАЯ ЗАРА» ВЫКЛІКАЛА НА САЦСПАБОРНІЦТВА КАМУНУ ІМЯ СТАЛІНА, ДРЫСЕНСКАГА РАЁНУ.

Новая фабрыка „Усход“ уступіла ў строй

Марш пераможнага наступленьня

800 рабочых скургалянтарэйнай фабрыкі **«Усход»,** а разам з імі і ўвесь пралетарыят БССР 31 ліпеня сьвяткавалі чарговую перамогу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва—адкрыцьцё новай фабрыкі.

Пад гукі пераможнага маршу бадзёра ішлі калёны рабочых на месца адкрыцьця новай фабрыкі.

Прышлі... Перад вачыма рабочага калектыву паўстаў новы трохпавярховы корпус фабрыкі. Зусім нядаўна тут быў пустыр, зарослы дзікімі расьлінамі. Зараз фабрыка гапарліва выглядае і кліча сваіх гаспадароў-рабочых заняць новыя пазыцыі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

Гудок сыроны паведамляе сёнешнім гасьцям, а заўтрашнім гаспадаром, што фабрыка гатова да пуску.

Твары ва ўсіх узбуджаныя, радасныя, бадзёрыя.

***

Гісторыя росту рабочага калектыву ф-кі «Усход» пачынаецца з 1924 году. У гэтым годзе быў арганізован так званы працкалектыў галянтарэйчыкаў з 12 чалавек. Шпаркімі тэмпамі лік рабочых павялічваўся. У мінулым годзе на галянтарэйнай фабрыцы ўжо налічвалася 600 рабочых, якія працавалі ў чатырох памяшканьнях, раскіданых у розных канцох гораду.

У гэтых старых, цёмных, у немэханізаваных «фабрыках» станавілася ўсё цясьней і цясьней працаваць. І вось на зьмену ім пабудавана **новая галянтарэйная фабрыка «Усход».** Яна здольна ўмясьціць у сваіх карпусох ня 600 чалавек, а больш 1.000.

***

Малады дырэктар фабрыкі тав. **Тумім** — рабочы-вылучэнец—пры адкрыцьці ўрачыстага мітынгу сказаў: «Таварышы! Новая фабрыка лёгкай індустрыі—гэта новая перамога рабочае клясы.



На мітынгу прысьвечаным адкрыцьцю фабрыкі.

Яна адпавядае апошнім указаньням тав. Сталіна, які гаварыў на нарадзе гаспадарнікаў—«...мы самі выступаем ціпер з пэўнымі патрабаваньнямі да рабочага,—патрабуем ад яго працоўнай дысцыпліны, напружанай работы, сацспаборніцтва, ударніцтва... **вялізарная большасьць рабочых прыняла гэтыя патрабаваньні савецкай улады ў вялікім уздымам і выконае іх па-гэройску...,** ажыцьцяўляючы патрабаваньні савецкай улады, рабочыя будуць у сваю чаргу даматацца ад яе выкананьня яе абавязацельстваў па далейшым паляпшэньні матар'яльнага і культурнага становішча рабочых»—**новая фабрыка забясьпечвае лепшыя ўмовы работы ва ўсіх адносінах і больш высокія тэмпы прадукцыйнасьці працы».**

З прывітаньнямі выступілі прадстаўнікі: **ад гаркому КП(б)Б—тав. Мэяровіч, ад гарсавету—нам. старшыні тав. Караневіч,** ад рабочых пабудовы фабрыкі—**тав. Палякоў,** ад старых рабочых фабрыкі—**тав. Маргенштэйн** і інш.

Пасьля мітынгу рабочыя аглядалі свае новыя сьветлыя, чыстыя цэхі, мэханізаваныя варштаты і г. д. У кожным цэху вывешаны квартальныя і месячныя прамфінпляны, нормы выпрацоўкі, прозьвішчы таварышоў, якія павінны працаваць у першай і другой зьмене. Рабочыя з вялікай увагай разглядаюць прамфінпляны, чытаюць загад адміністрацыі, які паведамляе аб тым, што з 1 жніўня рабочыя павінны зьвяпіца на работу ў новую фабрыку. Усе цэхі з першага дня адкрыцьця фабрыкі пераходзяць на гаспадарчы разрахунак.

— Наш энтузіязм—зарука далейшай перамогі ў выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну,—так зьвяўляюць рабочыя новай скургалянтарэйнай фабрыкі.

Увечары ў садзе «Прафінтэрн» для юбілераў быў паладжан адкрыты спэктакль трупы расійскай драмы, якая паказала пастаноўку «Чырвоныя зоркі». Перад спэктаклем адбыўся ляпучы мітынг, на якім былі прэміяваны лепшыя ўдарныя брыгады і асобныя рабочыя-ударнікі.

1 жніўня, пасьля чарговага адпачынку 800 рабочых скургалянтарэйнай фабрыкі пачалі працаваць па-новаму, у новых, добрых умовах.

Н. ГАФТ.

Першажнівеньская масоўка

31-га ліпеня адбылася вялізарная рабочая дэманстрацыя-масоўка, прысьвечаная Міжнароднаму антываеннаму дню 1-га жніўня

«Усе на абарону СССР», «Працоўныя—ў рады Асоавіяхіму» «Пралетарскае прывітаньне рабочым капіталістычнага Захаду і прыгнечаным народам усяго сьвяту», «Вайны ня хочам, але заўсёды гатовы даць адпор» і г. д.—г. д.—гаварылі шматлікія плякаты і пёзунгі.

У садзе «Прафінтэрн» адбыўся мітынг.

Член чэха-славацкай дэлегацыі, рабочы-мэтапіст тав. БЕЛЬСКІ ў сваім выступленьні намаляваў карціну падрыхтоўкі Чэха-Славакіі да вайны супроць СССР, падкрэсьліў здрадніцкую ролю сацыял-фашыстаў, якія актыўна падтрымліваюць наступленьне капіталістаў на рабочую клясу. У выпадку вайны супроць СССР рабочыя Чэха-Славакіі выступяць на абарону Савецкай краіны.

Дэлегат амэрыканскіх рабочых гаварыў аб вялізарным росьце беспрацоўя ў ПАЗШ, аб росьце ўзбраеньняў, аб тым, што за «мірнымі» фразамі аб «разбраеньні», аб «брацтве народаў» хаваецца шапёная падрыхтоўка да вайны.

Тав. РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, у сваёй прамове адзначыў, што фашысцкая Польшча зьяўляецца пляцдарыам інтэрвэнцыі; у Польшчы лютуе белы тэрор; нетыя прадстаўнікі рабочае клясы і працоўнага сялянства Заходняй Беларусі і Украіны кінуты ў засьценкі фашысцкіх турмаў. Прамоўца падкрэсьліў вялікую работу, якую праробіў МОПР.

Далей з дакладам аб міжнародным чырвоным дні выступіў сакратар Гаркому КП(б)Б тав. КАВАЛЬЧУК.

Масоўка закончылася рапартамі прадпрыемстваў г. Менску—заводу «Дрэнажапрацоўшчых», чыгуначнікаў, гарбарні «Бальшавік», друкарні імя Сталіна аб дасягненьнях ў барацьбе за прамфінпляны, аб тым, што рабочыя, занятыя сацыялістычнай будоўляй, ні на сэкунду не забываюць аб пагрозе ваеннай небясьпекі і заўсёды гатовы зьмяніць молат на вінтоўку.

МЕНСК

◆ З 1 жніўня МЦРК пачаў выдаваць ГАЗУ па 3 літры на чалавека па масійскай картцы № 19.

◆ Прэзыдыум Дзяржпляну на апошнім пасяджэньні выпучыў цэнтральную камісію па СКЛАДАНЬНІ ПЛЯНУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ. У склад камісіі ўваходзіць 36 чалавек з розных арганізацый. Старшыня камісіі—тав. ГОЛЬДБЭРГ.

◆ 3-га жніўня у 7 гадз. вечара ў памяшканьні клюбу імя Леніна адкрываецца ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД СТРАХ КАС ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЭРАЦЫІ.

◆ 2 жніўня адкрываецца 1-ы ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ЛЕСРАБКОПАЎ.

◆ 1 жніўня скончыўся ДЭКАДНІК ГРАМАДЗЯНСКАЙ АВІЯЦЫІ. Паводле далёка ляпоўных вестак сабраны па Менску 4.000 р. у фонд грамадзянскай авіяцыі. Зараз вядзецца вялікая работа па вярбоўцы лепшых ударнікаў у школу грамадзянскай авіяцыі. Фабрыка «Кастрычнік» выпучае 15 чалавек, завод «Бальшавік»—10 чалавек, ф-ка «8 сакавіка»—10 чал. і г. д.

Поўнасьцю рэалізаваць абавязацельствы на с.-г. машыны

Тэрмін рэалізацыі абавязацельстваў на с.-г. машыны скончыўся яшчэ 1-га ліпеня. Між тым, у гэтай справе мы маем глыбокі прарыў. На 10-га ліпеня кантрольная лічба рэалізацыі абавязацельстваў па БССР — 1.450 тыс. руб.—выканана толькі на 10,7 проц. Арганізацыі, на якія ўскладзена рэалізацыя абавязацельстваў, не аддаюць належнай увагі гэтай кампаніі. Так, Белкалгасцэнтр, райкалгассаюзы, сельска-гаспадарчая каапэрацыя і райкаапсаюзы, якія павінны былі рэалізаваць абавязацельстваў на 1.350 тыс. руб., выканалі заданьне толькі на 7,4 проц.

Райкалгассаюзы і райкаапсаюзы літаральна бязьдзейнічаюць. У лепшым выпадку яны абмяжаваліся вызначэньнем кантрольных лічбаў калгасам і сельсаветам. Праверкай становішча рэалізацыі на мясцох яны зусім ня цікавіліся. Ёсьць выпадкі, калі калгасы навет ня ведаюць аб гэтых абавязацельствах.

Той факт, што некаторыя раёны ня толькі выканалі, але і перавыканалі свае заданьні, паказвае, што там, дзе ўзяты сапраўды ўдарныя тэмпы, дзе кампаніі аддаецца максымум увагі, рэалізацыя прайшла з посьпехам. Так, ЖЫТКАВІЦКІ раён выканаў заданьне па калгасна-каапэрацыйнай сыстэме на 123 проц., АСІПАВІЦКІ райкалгассаюз высунуў сустрэчны плян рэалізацыі, з посьпехам выканаўшы кантрольную лічбу.

Некаторыя раённыя арганізацыі дзе гэтуль яшчэ не ўсьвядомілі, што ў залежнасьці ад выкананьня заданьня па рэалізацыі абавязацельстваў на с.-г. машыны будзе вядзецца крэдыт на гэтыя машыны. Несвачасовая рэалізацыя абавязацельстваў мэханічна выключыць з плянаў фінансаваньня машынна-забесьпячэньня БССР суму ў 1.450 тыс. руб.

Часу застапося мала. У бліжэйшыя дні трэба максымальна дарэсьвець рэалізацыю абавязацельстваў. Фрыдман.

Паведамленьні

Сёньня, 2 жніўня у 12 гадз. дня ў памяшканьні Культпропу ЦК адбудзецца нарада ўсіх загадчыкаў сэктароў цэнтральных газэт.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

— З 15-га жніўня ў г. Менску пачынае працаваць выязная партпройка ЦКК УсеКП(б) па разгляду апэляцый на рашэньні ЦКК КП(б)Б.

Парадак разгляду апэляцый наступны: 15-га ЖНІЎНЯ будуць разглядацца апэляцыі т.т.: КРОТАЎ М. М.—Журавіцкі раён, ГРЫЧЭНКА Я. Р.—Каралінскі раён, ДУШЧЫЦ А. Л.—Калінаўкічы, НЕВАЖЭНКА Т. А. — Ворша, КАРЛАЎ У. С.—Воркавічы, ЦЯРЭШКА Л. М.—Церахаўскі раён, АЎРУЦІН Я. М.—Віцебск, БАРКОЎСКІ—Мазырскі раён, ЛАБАНОЎСКІ Я. С.—Хвалынеўскі раён, ШАВРО Т. А.—Лепельскі раён, ФРАЛКОЎ І. У.—Ворша, ЕРМАЛЮГІН Я. І.—Ворша, МУЦ І. І.—Жыткавіцкі раён, СУХАДОЛЬСКІ П. Я.—Чырвонапольскі раён, СІДАРАЎ П. Ф.—Койданаўскі р., ЗАХАРАЎ К. Е.—Віцебск, ПЧАЛКОЎ В. Ф.—Дрэтунь, МАСЛАЎСКАЯ П. Ф.—Нова-Барысаў, МАРКІН В. С. — Бабруйск, ВІКТАРЭНКА—Чавусы, РАСЛАЎЦАЎ Л.—Гомель, ДЗЭМЧАНКА І. Г.—Полацк, САВІТКОЎ А. В.—Расоны, СКАВЫРКА А. І.—Полацк, КРУГЛІКАЎ В. Ф.—Полацкі р., КУШНЯРОЎ І. А.—Крупскі р., ВАЗЫЛЁНАК Я. М.—Віцебск, ШАКУН—Слуцкі р., ЭЛЬЯНАЎ С. С., ВРУШКО С. Т., КАХАНОЎСКАЯ С. Л. БЯРНАЦКІ Я. С., ЖЫТНІКАЎ А. К., ЛЕВІН С. А., ШЫМАНСКІ М. П., КАНТАРОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ А. Р., ЛЕВІН В. Н.—г. Менск, ЧАРНЯЎСКІ М. Р.—г. Гомель, НЕСЬЦЯРОНАК А. К.—Полацк, КРАСНОЎ П. М.—Віцебск.

На 16 ЖНІЎНЯ 1931 г.: ПЯТРУША І. К.—Бабруйск, ЛІРНАЎ Н. А.—Гарадокскі р., ГРЫБОЎСКІ П. Х. — Рагачоў, ХЛУТКОЎ П. В.—Полацкі р., КУЛЯШ Р. Х.—Уваравіцкі р., ВІРЫЛА С. Ф.—Пухавіцкі раён, ГАЛОЎКІН А. А.—Бабруйск, ЮРЭВІЧ В. Я.—Плешчаніцкі р., ЮРОЎСКІ Л. М.—Бабруйскі р., КАРАТКЕВІЧ П. К.—Выхаў, МАТАЛЫГІН В. М.—Крычаўскі р., ФІШАР Н. В.—Вярэяіна, ПЯТРУСЕВІЧ З. С.—Плешчаніцы, ВОЛГІНА М. І.—Ветрынскі р., ФРАЛОЎ М. М.—Жыткавічы, СІГЕР С. В.—Віцебск, МЕМЕЎСКІ Е. А.—Жлобін, САКОЛЬЧЫК А. Ф.—Полацк, СІМАНАЎ П. А.—Магілеў, КОНЧЫЦ В. Е.—Чавусы, СЯНКЕВІЧ П. Я.—Лепельскі р., ФАРВМАН Я. С.—Віцебск, ВАВІЦКІ А. М.—Мазыр, БАЛАВУТКІН Л. Л.—Сіроцінскі р., ЮШПРАЙХ Г. І.—Нова-Беліца, СКЛІВЕРАЎ С. Ц.—Заслаўскі р., БУТНО-ШЛЯХТА—Лёзьнянскі р., ГЛУШНЕЎ А. П., ВОЛК О. Ц., ХІТРАЕВ Г. Н., ШЛЯШЫНСКІ Л. І., СЛУШКО І. В.—Менск, ОЛЬМАН А.—Нараўлянскі раён, ВЯЛЯЕЎ П. П.—Чачэвіцкі р., КАРНАЧОЎ, КУЗЕНЕЦ—Менск, ГЕРАСІМАЎ М. М.—Гомель, ДОБЫШ П. С.—Вягольскі р., КАТКОВІЧ В. Ф.—Капыльскі р., СОСІС І Д.—Менск. Паседжаньне ПТ ЦКК УсеКП(б) будзе праводзіцца ў памяшканьні ЦКК КП(б)Б—г. Менск, Савецкая, 55. Просьба да апэлюючых зьяўляцца без спазьненьня. Праезд за свой кошт.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ — Першая г. кавяя мастацкая карціна **Пуцёўка ў жыцьцё** Драма ў 34 эпізодах

Культура Пач. 7.8-45;10-30 — З 1 жніўня мастацкі фільм **ЖОНКА** Звыш праграм. часопіс Белдзяржкіно

„Пралетары“ Адкр. з 12 г. дня. — 2 сэрыі, 18 част. у адзін сэанс **СТЭНЛЕЙ** у нетрах Афрыкі.

„ЮНЫ ПІНЭР“. — Гэтымі дніямі ў памяшканьні кіно-„Культура“ адбудзецца адкрыцьцё кіно „ЮНЫ ПІНЭР“ **сачэнне за рэклямай.**

„СПАРТАК“ Пач. у 7-15, 9.10-45 Каса—з 5 гадз. — Выдатны фільм з жыцьця хунгузаў **ІМСЬЦІВЕЦ** драма ў 7 частках

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Ад 2 жніўня штодзённа занежны мастацкі фільм **ПРАКУРОР ЮРДАН** драма ў 7 частках. У галоўных ролях: **Мэры Джансон і Гэнс Мірэндорф.** ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: кіно-часопіс саюзкіно № 33. Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадз. Каса з 5 гадз.

РАГАЧОЎСКАЯ КААПШКОЛА абвяшчае **АСЕНЬНІ НАБОР** вучняў у школу каапэрацыйнага вучнёўства на адд. абмену і разьмеркаваньня. Прыём праводзіцца на базе 5-годні ва ўзросьце ад 16 да 18 год. Заявы прымаю